сындром бясконцага чаканьня.
Сягоньня — жах, пустэча, боль,
сындром цяжкога прадчуваньня.
Заўтра — пустэча, боль, цяжар,
сындром нязьдзейсьненых жаданьняў.
А потым — сьвятло, адлюстраванае ў вадзе,
салёны вецер з вострым пахам ёду,
цяжар, ля ног упаўшы на зямлю,
свабода, свабода, свабода...

poems on liberty

Natalla Chrušč

Yesterday, dark, fear and emptiness,
syndrome of an eternal waiting.
Today, fear, emptiness and pain,
syndrome of harsh anticipating.
Tomorrow, emptiness, pain, load,
syndrome of false hopes, unsated.
And then, light mirrored in the water,
a bitter tang of iodine on salt breezes,
the load, now fallen, lying at your feet,
freedom, freedom, freedom.

Уладзімер Някляеў

І доўгі час,
і вокамгненны час
нам дадзены ад раніцы да ночы,
і кожны з нас
здабудзе волю двойчы,
і двойчы згубіць волю кожны з нас.
Рака крыві за волю празь вякі,
калі і хто той волі меў даволі,
зацятыя рабы зацятай волі
такія ж, як яе рабаўнікі.
Усім на волю Бог дае іспыт,
і не займець збаўленьня ад іспыту,
адзін раз воля,
калі мы — зь нябыту,
другі раз воля,
калі мы ў нябыт.

Uładzimier Niaklajeй

A long time
or a mere eyeblinking trice
is given us from dawn until night's cover,
and each of us
must win freedom twice over,
and each of us will lose that freedom twice.
Rivers of blood for freedom through long years —
but who and when will have his fill of freedom?
The stubborn slaves of that so stubborn freedom
no different from freedom's thieves appear.
God gives the test of freedom to us all,
and from that test there's no escape nor fleeing,
freedom once when
we come out of non-being,
freedom when back
into non-being we fall.

Юрась Чарнякевіч

На полі белым
Стужкаю блакітнай
Кроў пульсуе,
Як дзень — быцьцё
З усходам
І зьмяркаíньнем,
Тусоўкамі паэтаў-наркаманаў
Пад музыку
Рытмічную, як час...
І хочацца
Зьвярка па імю
Status quo
Забіць нажом у сэрца
І зрабіць зь ягонай скуркі
Шалік для матулі —
Падарунак.
І курчыць,
І сьціскаць сэкунды,
Нібы гліну,
Ствараючы зь яе,
Напрыклад, Еву
З трыма рукамі,
Каб туліла моцна,
І закахацца ў гэтае стварэньне
Ня больш, чым на імгненьне.
Так, на некалькі начэй
З рыпучым ложкам,
А потым можна
Выставіць яе за дзьверы,
Уклаўшы ў руку
Грошы на таксі,
Пацалаваўшы напасьледак,
І — напіцца,
Жыцьця набрацца,

Juraś Čarniakievič

On a white field
An azure ribbon
Of blood pulsates
Like day — like being
With sunrise
And sunset,
With covens of poet-addicts
To music
Rhythmic as time...
There's a wish
To stab to the heart
That beastie by name
Status quo
And to make out of its skin
A stole for dear old Mum —
A present.
And to write out,
And squeeze out the seconds,
Like clay,
From which to create,
For example, an Eve
With three arms,
All the better to hug,
And to fall in love with this creation,
For no more than a twinkling.
So, several nights
On a creaking bed,
And then you can
Put her out of doors,
Shoving the taxi fare
Into her hand,
Kiss her a long 'goodbye'.
And — get drunk.
Get tanked up with life,

Быццам жаба гразі,
Каб нарадзіць чарговага дзіцёнка
На сьнежным полі
Аркуша
У сшытку.

poems on liberty

Like a frog with mud,
To give birth to another bantling,
On the snowy field
Of the page of
A notebook.

Натальля Бурдзейка

Размокнуць засохлыя фарбы
затрымціць у чаканьні папера
хлынуць колеры
і бязьлікі аркуш успомніць
што калісьці быў дрэвам
выпусьціць парасткі
спужаная птушка
прарве малюнак

poems on liberty

Natalla Burdziejka

The long-dried-up paints will grow moist
paper tremble in anticipation
the colours will gush
and the faceless sheet will remember
that once it was a tree
and put forth new shoots
and a frightened bird
will rend the painting

Янка Лайкоў

Ня плач, паэт,
калі не жывеш
ні ў царкве, ні ў касьцёле, ні ў пагадзе,
глыбокім сумам народжаны верш
на сум высокі асуджаны загадзя.
Яшчэ ты бавісься ў снах,
а страх
навечна страціць душу адзіную
цябе на вогненнакрылых вятрах
з вышынь,
дзе ў захмарных лунаў вірах,
вяртае долу пуцінамі дзіўнымі.
І ты, спавіты зямным сьвятлом,
натхнёна словы ў радках высьпельваеш,
сьвітанак разгараецца за акном,
распраўляе крылы,
ясьнее верш.

Janka Łajkoй

Weep not, poet,
that you do not dwell
in chapel or church or pagoda,
a poem that's born out of sorrow's deep well
to high sorrow is doomed and foreboded.
Still you play as you dream in your bed;
but a dread
that you'll lose this your one soul forever
plunges you, on the fire-winged winds, sped
from heights
where you rode winds of the zenith
to return to the depths by strange pathways.
And you, swaddled in earthly light,
inspired, now ripen the words in your lines,
beyond the window dawn blazes bright,
spreading its wings,
more brilliant your verse shines.

Вольга Ўгрыновіч

Не сьпяшацца
бо ўсё прадугледзела памяць
не вагацца
на шалях уласных віроў
бо так лёгка
сьлязу пераважвае камень
і няхутка
сьвятлом напаўняецца збан

За маўчаньнем
дакладнымі ведамі стратаў
у злучэньні
няроўных часоў
нараджаецца зорная назва
з рыфмаванай выявы майстроў

Будзе споведзь
раскруціцца срэбнае кола
як ганчарны агмень
і адбудзецца
новая вобразнасьць формы
падарунак за сьмерць

Volha Ŭhrynovič

Do not rush fevered
for memory has foreseen all
do not teeter
on the balance of your own whirlpool
for so easily
stone outweighs a tear-drop
and not speedily
is a vat filled with light

Beyond the silence
in precise statistics of losses
in linkages
of unequal times
there will be a starry name born of
images of a master's rhymes

There'll be confession
a silver circle whirling
like a potter's flame
and there'll arise
a new imagery of form
an offering for death

Віктар Сьлінко

іржой
пераела
ключ у дзьвярах замкнутых знадворку і таму
хата здаецца пакінутай але гэта ня так:
праз разьбітыя шыбіны
асядае пыл з далёкіх гасьцінцаў вецер страсае
на падлогу падзяўбаны птушкамі чарнасьліў
у паштовай скрыні ляжыць сатлелы ліст
ад мяне — некалькі літар мурашы
ужо сьцягнулі

помніш —
некалі я крэсьліў на вадзе: НІЧОГА НЯ БУДЗЕ
а ты
прыціскала да грудзей (бліжэй да шыі)
маленькія тонкія рукі быццам баялася
што я табе
нешта зраблю?

так яно і цяпер:
у пукатыя вочы статуй кідаецца гурма
груганоў і дні ня хочуць пакінуць самому сабе
таго чыё семя так і не прарасло
каму
мы маўчым?
ноч прынесла цемру як чорнае гольле
чырвоныя рукі
пабачаць цела
так мы толькі рукі якімі нехта
трымае вуглі!

будзе сьвяціцца ў куце абраз

Viktar Ślinko

rust
has eaten through
the key to those doors locked from outside and hence
the house appears abandoned but not so:
through the shattered window-panes
dust from the distant highways settles the wind shakes down
on to the floor prunes the birds neglected
in the mailbox lies a mouldering letter
from me — the ants have already thieved
several characters

do you recall
once I wrote on water: NOTHING WILL COME OF IT
but you
pressed your small thin hands to your breasts
(closer to your neck) as if afraid
that I would do something
to you?

and so it is now:
into the bulging eyes of a statue a cast
of ravens dives, and the days do not wish to leave
to himself the one whose seed never sprouted —
for whom
do we keep silence?
the night has brought darkness like black branches
scarlet hands
will see the body
so we are only the hands by which someone
holds lives!

in the corner an icon will gleam

...і мучыцца парастку й зерню пакуль
мы праваленым ротам шапялявім «каханьне»
але
чуеш: гудзе
у кроснах чарэшняў?
гэта

Бог ідзе з посахам
пчалінага рою
Бог хоча
разьвязаць нам
языкі

...and the shoot and the grain will suffer until
our ruined mouths mumble the word ‘love’
but
do you hear: hooting
in the loom of the cherry-trees?
this

is God walking with a staff
of a swarm of bees
God wants
to loosen
our tongues

Тацяна Будовіч

Начны нядрэмны мой
канвой

Ланцуг твой не парваць
ня зьняць
і я
твая

Дай мне зрабіць хоць крок
убок
знарок
у змрок

Загінеш змрок накрыў
абрыў

І чорная трава
як твань
на ім
пад ім

У сэрцы прарасьце
ўрасьце

Тут выйсьця не знайсьці
ісьці

Ісьці ўвесь час здалёк
скрозь змрок

Taciana Budovič

My night escort that keeps
without sleep

Thy chain never broke
nor unyoked
and I
am thine

Grant me at least one stride
aside
to mark
into dark

Thou'lt perish darkness hid
the pit

And then the black grass
like marsh
on it
'neath it

Through the heart will rive
and thrive

No escape can we know
to go

Far for all time to trek
through the dark

Усевалад Гарачка

Каб жыць — і ня ведаць,
на якія вяршыні
ступаеш,
што кожны наш крок —
па-над прорвай;

не баяцца
збудзіць матылёў
бляклакрылых,
што зь безданяў
вылятаюць раямі;

не шукаць таемныя сэнсы
карункаў
іхнага танцу,
што ў адзіным:
жыць і — ня ведаць.

Usievaład Haračka

To live — and not know
upon what lofty summit
you step,
and that each step we take
is over a chasm;

and not fear
to awaken the azure-
winged butterflies
that from the abyss
fly up, swarming;

and not seek mysterious meanings
in the lace
of their dances,
whose only meaning is:
to live and — not know.

Ксеня Брэчка

Вялізнае
чырвонае
вока
Хоча
у мяне
залезьці
І прачытаць
усе думкі
І пазбавіць мяне
зроку
Каб застацца ў мяне
адзіным
Самым
каштоўным
вокам.
Але я яго
асьляплю
І нават прадзіраўлю
чырвань.
І зь яго
пацячэ
вонкі
Нешта глеістае.
Мабыць то —
ягоныя мазгі.
Хай цяпер
усе
глядзяць
Што было знутры
ў той пачвары
Хай цяпер
тое вока
зыркатае
Расплюшчвае сябе
дзеля натоўпу!

Ksienia Brečka

A gigantic
red
eye
Wants
to pierce
into me
And to read
all my thoughts
And steal my power
to see
And so become
the only
Most precious
eye
for me.
But I shall make blind
its sight
Even pierce through
the redness.
And from it
there will
flow
Something viscous.
Maybe this is
its brains.
Now let
all people
see
What was within
that monster
Now let
the piercing
eye
Open itself
for the crowd!

Серж Мінскевіч

тупік
перад вачыма
гладкі
        квадратны
тупы тупік
і зьлева
        і справа
і зьверху
і са сьпінаў
мы — птушаняты цаглінаў
і хіба ж палова
глупотных
            нямоглых
згадуе
        дзюбы і думы
для праклёну
тупіковай
            скарупы

Sierž Minskievič

dead-end
before the eyes
smooth
        and square
dead blunt dead-end
to left
        and to right
and above
and behind
we are unhatched chicks of brickwork
and maybe one half
of us senseless
            and strengthless
with brain
        and beak will wreak
perdition
on this dead-end
            shell

Вальжына Морт

«Не прислоняться!» —
Я — дзьверы ў вагонах мэтро.
«Не прислоняться!»
Моцна трымайце ў ахапках
і думкі, і справы.
Я на наступным вазьму
й адчынюся направа.
Стоп! Вам далей!
А на гэтым сыходзіць Варава!
Я за шчакой яго позірк насіла бяз кпінаў.
Я па вушных лябірынтах Вараву вадзіла.
Ён жа складаў кубік-рубік з маіх
успамінаў,
і я галавой упіралася ў безвыходнасьць.
А я ўпіраюся ў безвыходнасьць,
нібыта
ў дзявочую цноту, пляву і іду па тым лёдзе.
І прагну зваліцца ў ваду, гучна крыкнуўшы:
«Годзе!»
І зноўку заўсёды знаходжу ўваход у
безвыходнасьць.
Так — «Не прислоняться!»
Я — дзьверы ў вагонах.
Я — дзе вы?
Заенчылі і застагналі прагаліны моваў.
Я разразаю жывот вамі згубленых словаў,
І потым вымаю адтуль
пацукоў і пачуцьці.

Valžyna Mort

'Stand clear! Do not lean!'
I'm the door of the metro train.
'Stand clear! Do not lean!'
Keep a firm grip, holding
your thoughts and deeds tight,
for at the next station,
I'll open on the right.
Stop! Move along!
This is where Barabbas alights!
I kept his glare behind my cheek without mockery.
I led Barabbas through the aural labyrinths.
But he made a Rubik's cube of my
memories.
And I pressed my head against no-exitness
and I press on no-exitness
like
a maiden's virtue, a hymen, and I walk on that ice.
And I long to plunge into the water, shouting
'Suffice!'
And again as ever I find the way-in to
no-exitness.
So: 'Stand clear! Do not lean!'
I'm the door of the metro train.
I am — where are you?
Felled-clearings of languages whinge and moan
I rip open the guts of lost words you once owned,
and then take out of them
rats and feelings.

Зьміцер Вішнёў

Проста ўзяць нож і адрэзаць сваю галаву
Лепш на марозе — ня так балюча
Гэта — прывітаньне чабанам
Чырвоная лава льецца на трон
Выціснуць вочы пальцамі
І пагуляць ў спортлято
А калі да цябе прырасьце жанчына
Трэба яе таксама адрэзаць чымсьці
Гэта — не салют
Гэта — я самурай люты
Гэта — тайфун
Мець у руках тысячы ангельскіх фунтаў
Шчыліць жоўтыя зубы
Біць дыктатара правай і левай нагой
Каб і ягоныя вочы кінуць на лятатрон
Ці гэта не прыродны рэфлекс?
Ставіць на вушы чыноўнікаў кляксы
Каб з атраманту зварылася каша
Потым цудоўна глядзець на карціну Ван Гога
З марыхуанай загарнуўшыся ў тогу
Гэта — свабоды вагон
А не бабы з вадой

І потым доўга трымаць адказ перад Богам
За свой дубовы бадун і свабоду

Źmicier Višnioŭ

Just take a knife and chop off your own head
Best when it's frosty — that's not so painful
This is a greeting for a shepherd
Red lava is flowing on to the throne
Put out your eyes with your fingers
And then play the lottery
And if a woman should start growing into you
She too must be cut off in someway or other
This is no firework
This is I, the fierce samurai
This is a typhoon
To have a grip on thousands of pounds sterling
To snarl with yellow teeth
Kick the dictator with right foot and left
So as to throw his eyes in the tombola
Is this not a natural reflex?
To put blots on the ears of officials
So that porridge will be boiled from ink
Then wonderfully look at a Van Gogh
Wrapped in marijuana like a toga
This is the carriage of freedom
Not beans with water

Then stand for long responsible to God
For your oak hangover and for freedom

Вера Бурлак

Прывітаньне табе, РА.
У нашым горадзе,
Добрым месцы,
Не сказаць, каб чорным, але
Дзе штодзень па радыё кажуць,
Нехта робіць чорныя справы
І ня робіць чырвоных спраў,
Што наогул ужо займальна,
Дзе штогод бывае зіма
(І па радыё кажуць, робіць
Свае белыя справы), нехта
Выклікае мяне да дошкі.
Мне патрэбна ісьці па кветках,
Што рыпяць пад нагамі, бо
Яны падаюць зь неба, калі
Нехта робіць белыя справы.
— Не падкажаце, як прайсьці
Да бліжэйшае дошкі?
— Блэкборда?
— Я ня ведаю, блэк ці ўайт.
Гэта вельмі істотна?
— Наўрад ці.
Скрэташ лефт, потым скрэташ райт,
Потым проста, проста, проста,
Па сонцы тварам на ўсход.
Па чырвоных плямах на сьнезе
Прасачыце мой шлях. Па ружах
Непрытульны сабака Блэк.
Блэк ня ведае месца і часу,
Толькі пах і сьлед. Па сьлядах
Ён, напэўна, нарэшце знойдзе
На чырвоным сьнезе
                    чорную дошку
Зь белым надпісам РА...

Viera Burłak

All-hail to thee, O RA!
Here in our town
— Quite a good place —
I won't call it black, only
Where, every day, as the radio says,
Someone perpetrates black deeds,
But does not perpetrate red deeds,
Where every year there is winter
(Which, as the radio says, perpetrates
Its own white deeds), someone
Calls me to a sign-board.
I am obliged to walk on the flowers
Which are crushed beneath my feet, for
They are falling from the sky, when
Someone perpetrates white deeds.
'Please, would you point me out the way
To the nearest signboard?'
'A *blackboard?*'
'I don't know if it's *black* or *white*.
Does it really matter?'
'Probably not!'
You take a *left*, then take a *right,*
Then straight, straight, straight ahead,
By the sun facing us to the east,
By the patches of red on the snow,
You point out my path. By the roses
Blackie, a stray dog, appears.
Blackie knows no times or places.
Only scent and trail. And by trails
He will surely at last discover
On the white snow
                    a black board
With the white inscription: RA...

Я заўважыла ў нашым горадзе,
Добрым месцы, між іншым, хоць кажуць,
Што бывае і лепш, паўсюль:
ГастРАном, рэстаРАн, гаРАж,
КРАма, РАдыё, пРАмтавары,
РАзьліковы РАхунак, РАда
ВэтэРАнаў, аэРАпорт,
ДРАматычны тэатар, кантоРА
Па баРАцьбе з таРАканамі
Пры дапамозе хлёРА.
Ahora, vamos!* Хто скажа,
Што ў нас ня сонечны гоРАд?
Гэта будзе памылка пяРА.
Прывітаньне табе, РА.

* Ну, паехалі! (гішп.)

I have noticed, here in our town —
— A good place, by the way, though it's rumoured
That here and there you'll find better —
High-gRAde foods, restauRAnt, gaRage,
Shopping paRAde, RAdio, GeneRAl Store,
Cash withdRAwals, VeteRAns'
AdministRAtion, air tRAnsport,
DRAma theatre, DirectorRAte
For eRAdicating RAts
(By tRApping).
Ahora, vamos!* Who proclaims
Our town does not know the sun's RAys?
That would be a gRAve error.
All-hail to thee, O RA!

* Well! Let's go! (Spanish)

Віктар Жыбуль

Я не хачу быць пупом зямлі.
У зямлі й безь мяне хапае пупоў.
Я хачу быць пупом неба.
Паветранай ямай і чорнай дзіркай
быць я хачу.
Там болей волі,
болей свабоды
там.

Уявіце:
я,
і мае пупы,
і пупы пупоў маіх
глядзяць на вас
зь неба.
Ніхто не схаваецца
ад іхнага пільнага позірку.
Не, гэта ня я раствараюся ў аблоках —
гэта аблокі расплываюцца ўва мне!

Цяпер
кожны, хто патрапіць
пальцам у неба,
патрапіць у мяне,
і ў мае пупы,
і ў пупы пупоў маіх
трапіць ён,
а я нават не адчую.

Што?
Вы ня верыце ў маё
ўсепупейшае пупства,

Viktar Žybul

I don’t want to be navel of the Earth.
Earth has navels galore, it doesn’t need me.
I want to be the sky’s navel.
An air pocket, a black hole’s
the role for me.
There is more freedom
and more liberty
there.

Be it known:
I
and my navels
and my navels’ navels
observe you from
on high.
No one can hide himself
from this diligent scanning.
No, you do not see me dissolving in clouds —
it is clouds dissolving in me!

And now
each person who tries
to reach for the sky,
reaches for me,
and my navels,
and the navels of my navels.
He reaches me,
but I don’t feel him touch me.

What?
Don’t you believe in my
all-navelish naveldom,

у маё
найпаўнейшае
найпупоўнейшае пупейства,
у маё
архіпуповае апупенства?

Тады спытайцеся ў таго,
хто зламаў палец аб неба.

in my
supernalism of
supernavelmost navelity,
in my
archinavel navelescence?

Then go, ask the man who reached
for the sky and broke his finger.

Мары Эдэм

Перакуліць усё дагары нагамі — ня цяжка!
Рассыпаць павуціньне плётак, нагавораў — ядам,
А пасьля цягнуць, як павук, за нітачку — лёгка.
Прыдумаць усё, як кінасцэнар, — можна.
Мы ўсе акторы, пешкі, мятлікі — міжволі.
Ня хочацца, не падазраеш? — выбух!
Сустракаюцца каханьне і нянавісьць у келіху —
бывае.
Аднак веру разьбіваць і катаваць надзею —
нельга.
У сетцы з будзённых і прыгожых слоў-мятлышак
Павук сядзіць, сьмяецца зь лёгкай і прывіднай —
свабоды.
Пляце і вычвараецца над пачуцьцямі — паэт.
Быць проста людзьмі? — немагчыма.
Паўсюль маскі, і гульня цікуе за вамі.
Вам выкараскацца з тэатру жыцьця — аднаму.
Цяпер і плесьці, і сьмяяцца, і гуляць буду — я.

Mary Edem

To turn everything topsy-turvy is no problem!
To spread the spider-webs of gossip and poisoned
slanders,
Then like a spider to tug the thread is easy.
To invent everything like a film script — well, maybe.
We are all actors, pawns, butterflies, willy-nilly.
You disapprove, you disagree? Explosion!
Love and hatred meeting in one goblet happens.
But to shatter faith and torture hope — you cannot.
In web of butterfly-words, everyday, fair-sounding,
The spider sits and mocks at that frail phantom —
freedom.
There is one weaves and warps these cobweb-tales —
the poet.
To be simply human? Not an earthly.
Masks everywhere, the game ever pursues you.
You are sole audience of life's theatre.
The one who now will weaves, warp, play — is I.

Алесь Сьпіцын

Мы ранкам зь цяжкасьцю ўставалі,
бо радасьць ранку не для нас.
Яму насустрач пазяхалі
і праглі, каб ён дзесь захрас
ў слаце дарожнай. Ды нязьменна
ён нас прыходзіў мучыць зноў.
І, дзень пракляўшы, мы ганебна
заміж гарачай кавы кроў
глыналі, ўпотай зачыніўшы
душу ад позірку свайго,
наліўшы ў шкло сваіх кілішкаў
жыцьцё сяброў. Ніхто ня мог
спыніці круг саромнай звычкі,
і толькі сонна пазяхаць
адно быў здольны род няцьвічны...
Наш род. Аб чым яго пытаць?
І мы зяхалі. Зьеўшы сонца,
дашчэнту вызяхаўшы дзень,
мы мелі ноч за абаронцу,
ды мы ня зналі і яе.
І ночы зорнае скрыжалі
нам зноў выносілі вырок:
«Яны свабоду ўшчэнт зьзяхалі,
і хто спыніць іх мог, хто мог?»

Aleś Śpicyn

Reluctantly, we rose at morning,
for morning brought to us no joy.
We met it with a weary yawning.
Craving that somewhere the road's cloy
of mire would halt it. But, unchanging,
it came to torture us again.
And, having cursed the day, ashamedly,
not boiling coffee did we drain
but blood, and closed off, hugger-mugger,
our soul concealed from our own sight,
and into the glass of our tumblers
we poured our comrades' life. None might
halt that round of shameful habits,
for drowsy yawning, nothing more
could that lethargic kindred manage...
Our kindred. Who'd ask something more?
And on we yawned. The sun descended,
and we'd yawned out the livelong day.
And though the night came to defend us,
we did not know it anyway.
And so the starry night was speaking,
passing sentence on us anew:
'Freedom they yawned away entirely,
and who was there could stop them? Who?'

Ганна Ціханава

Чалавек — згустак цела з душою,
Скрыжаваньне пачуцьцяў расьпятых,
Расьцякаюцца ў венах з крывёю
Мары хрусткія. Зьдзейсьніць іх — сьвята.

Нескančоная лесьвіца, крокі —
Тыя ж людзі — палёт у пустэчу,
Мы жывыя, мы вечнае вока,
Але часам здаецца, мы — рэчы.

Чалавек — зь веку ў век — быў часовасьць,
Пабудова з крупінак турботы.
Рэчаіснасьць і дух крышталёвы —
Гэта ўсё чалавек, не істота.

І паўсюль ён шукае свабоду...

Hanna Cichanava

Man is a cluster of soul and body,
Crucified feelings met in conjunction,
Fragile dreams in the bloodstream throbbing —
To make them real is a festival's unction.

A stairway never-ending, steps passing —
The same people — a flight into emptiness lonely,
We are living — an eye everlasting —
Yet sometimes we seem — objects only.

From age to age man was but a temporality,
Grains and cares in a construct fleeting,
Spirit of crystal and reality
Man thus entire — not a mere creature.

And everywhere he seeks for freedom...

Ільля Сін

зялёныя вочы яе гэта рухі ў нябесную
несьвядомасьць. Мы ішлі па блакітнай даліне
ламаючы цені шкляных зорак і трушчачы
чыгуновых карлікаў. Дождж які падае
зьнізу ўверх пераўтвараўся ў фаервэрк
на Дзень Салодкае волі. Потым усё зьнікла
і катафальк з кавалачкамі мяне рушыў назад
раскалоўшы твой сон.

Illa Sin

Her green eyes are movements in heavenly
consciousness. We went through the blue valley,
breaking the shadows of glassy stars and shattering
iron dwarves. The rain, falling upward, was turning
into fireworks for the Day of Sweet Freedom. And
then everything disappeared, and the catafalque
bearing fragments of myself moved backwards,
shattering your dream.

Вольга Гапеева

я бяздомныя рухі цела свайго
я бяздомныя рухі цела свайго напаткаю
у завані між караблёў п’яных
дзе павуціньнем разьвесілі кашаль
на дрэвах
аглохлых ад вачэй безьлічы
дзе шкарлупіньне на шкло налепла
мне — не адшкрэбсьці
і белая вусьцішнасьць
матыльком сядае
на голую сьпіну
вольную ад крылаў ад крыкаў ад пацалункаў
мая свабода навыварат
пляце сабе кокан
і кожны з нас вусьцішнасьць
і кожны з нас паасобку

Volha Hapiejeva

homeless movements of my body shall I
homeless movements of my body shall I meet
among drunken boats in the harbour
where a cough is hanging like cobwebs
on trees
deafened by uncounted eyes
where I cannot scrape away shell
that is glued on to glass
and a strange white calm
like a butterfly settles
on the naked spine
free from wings from whinges from kisses
my inside-out freedom
spins itself a cocoon
and each of us is that calm
and each of us is alone

Юрась Пацюпа

— Пудзіла, пудзіла, што ты вартуеш?
— Тайну дзяржавы, ня бачыш — замок!
— Зрэбнае пудзіла, хлеў твой пустуе,
а гаспадар задушыўся знарок.

Люду анучамі служаць штандары,
золата трону паела іржа,
цьвільлю па сьценах поўзаюць мары,
рэчы, як войска, упокат ляжаць.

Толькі і скарбаў тваіх — тыя дзьверы,
стрэльма з ручніцы ў іржавы замок!
Пудзіла ў неба глядзіць зь недаверам,
Бог рытарычнай фігурай замоўк.

Juraś Paciupa

‘Scarecrow, O scarecrow, what are you guarding?’
‘State secrets! There is the lock, don’t you see!’
‘Your byre is empty, you rag-and-bone warden,
and your master has gone hanged himself from a tree!

Banners now serve as toe-rags for the people,
rust has eroded the gold of the throne,
on the walls phantoms like mildew are creeping,
things, like an army, lie flat in a row.

These doors are your only treasure. Come, shoot then,
Musket-fire that rusty lock will release!’
Scarecrow stares up at the sky, filled with doubting.
Like trope of rhetoric, God holds his peace.

Натальля Ўласава

Шэпты лясное вады у халодным
аеры
Здані начныя па курганах спаўзаюцца
хомарам
Вільгаць травы робіць нашыя ногі
босымі
Вецер у дрэвах робіць нашыя подыхі
голасам.
Рухі галінаў бачацца менш
павольнымі
У лесе курганаў хутка надыдзе
раніца
Першыя промні зробяць нашыя вочы
вольнымі
Трызьненьне ночы зробіць нашыя целы
памяцьцю.

Natalla Ŭłasava

Whisper of forest waters in the cold
air
Night ghosts on the gravemounds in a crowd
creeping
Moisture of the grass makes our feet
bare
Wind in the trees makes voices from our
breathing.
Movement of branches seems less slow
restrained
In the wood of the gravemounds dawn will come
rapidly
The first rays will make our eyes free from
constraint
Night frenzies will make our flesh a
memory.

Анатоль Брусэвіч

Сон сплывае срэбнаю слотаю,
Выспы восеньскіх вокнаў вось-вось
Апякуць агнявымі агорткамі
Бясклапотную безьліч бяроз.
Одум оргіяў, ордэны, ордэры,
Дагараючы джаламі дробнымі,
Адраджэньня абвесьцяць анонс.

Anatol Brusevič

Slumber streams like silver solvent,
Islands of autumn oriels, alerted
Frizzle with their fiery fabrics
The burden-free battalions of birch-trees.
Onus of orgies, orders, observances,
Smouldering slowly with small stings,
Recite the rubrics of revival.

Марыля Васючэнка

Бел-чырвоныя хвалі
песьцілі зямлю,
на якой Яна ўзрасла.
Вершнік
аберагаў
Яе магутнае сьцябло.
Араты
абмінаў тое месца,
каб не зачапіць Яе.
Пясьняр
апяваў
Яе аксамітныя пялёсткі.
Мастак
натхняўся
Яе пахам.
Вернік
маліўся
на Яе лістоту.
А Яна
дарыла кожнаму
веру...

Але прыйшоў хам
і затаптаў Яе.
І хвалі пазелянелі,
бо Яе не было.
І вершнік
зьнік,
бо Яе не было.
І араты
кінуў барану,
бо Яе не было.

Maryla Vasiučenka

White and red waves
caressed the earth
on which She grew.
A rider
mounted guard
over Her mighty stalk.
The ploughman
passed to one side
so as not to touch Her,
the bard
sang the praise
of Her velvet petals.
The artist
was inspired
by Her fragrance.
The believer
said prayers
to Her foliage.
And She
granted to each
true faith.

But then came an oaf
and trampled Her down.
And the waves turned to green,
for She was no more.
And the rider
vanished,
for She was no more.
And the ploughman
cast away his harrow,
for She was no more.

І пясьняр
кінуўся з выспы,
бо Яе не было.
І мастак асьлеп,
бо Яе не было.
І вернік
зьнішчыў храм,
бо Яе не было.
А хам
рагатаў,
бо Яе не было.

Аднак Яна,
неўміручая,
уваскрэсла.
І ўсё вярнулася
на свой адвечны шлях.
Кола замкнулася.
Толькі ў паэта —
абсмаленыя крылы.

And the singer
cast himself from an island,
for She was no more.
And the artist
went blind,
for She was no more.
And the believer
pulled down the temple,
for She was no more.
But the oaf
roared with laughter,
for She was no more.

But She
the unkillable
rose again.
And all was restored
to its primordial path.
The circle was closed.
Only the poet
was left with singed plumage.

Андрэй Гуцаў

Па нюансах, як па клявішах, прайдзіся,
Дух свавольны, патаемны, незямны, —
Па аблоках, як па крыгах, скачуць рысі
Нестрыманае, драпежнае вясны!

Напляваць на прамінулыя няўдачы,
Напляваць на мной пакрыўджаных калісь —
Нестрыманая, па дрогкіх душах скача
Неўміручасьці прылашчаная рысь!

Завагайся, дасканалае Тварэньне,
Нечуванасьці дасьціпных слоў і нот —
Каб збудзіліся былыя пакаленьні,
І картавы Бог-маўчун разявіў рот!

Па жаданьнях, як па клявішах, прайдзіся,
Жах зьдзяйсьненьняў, патаемны, незямны, —
Па аблоках, як па крыгах, скачуць рысі
Неўміручае, рэальнае вясны!

Andrej Hucaй

Nuance to nuance, go as if on a keyboard,
Spirit self-willed, secret, unearthly thing, —
From cloud to cloud, as if on ice-floes leaping,
Run lynxes of unreined, rapacious Spring!

To spit upon past shortcomings and failings,
To spit on those who took offence from me —
From soul to feeble soul leaps, unrestrainedly,
The hand-tamed lynx of immortality!

Wage your fight, perfect Creature, so to break the
Inaudibility of notes, wit, words, —
So that past generations will be wakened,
The lisping Silence-God make himself heard!

From wish to wish go as if on a keyboard,
Unearthly secret dread of accomplished things, —
From cloud to cloud, as if on ice-floes leaping,
Run lynxes of the real, immortal Spring!

Вольга Бярозка

Блакітам неба
і зьзяньнем зор,
усьмешкай сонца
і пахам ветру,
як быццам шляхам
мінулых дзён,
праходзіць рэха,
сузор'яў рэха...
Сьвятло сузор'яў,
магутны бор
і сьпеў празрысты
папараць-кветкі,
як быццам вежаў
старых палон —
ўсё гэта рэха,
каханьня рэха.
Вось так імгненна
і на гады,
так выпадкова
і назаўсёды
аднойчы ўгледзець
сьляды, сьляды
сваёй няволі,
сваёй свабоды.

Volha Biarozka

Through the sky's azure
and the stars' shining,
the smile of sunlight,
and scent of zephyrs,
as if on paths of
antiquity,
there runs an echo,
the star-groups' echo...
The light of star-groups,
pine-forest vast,
transparent singing
of flowers on bracken,
like ancient watch-towers'
captivity —
all this is an echo,
all this is love's echo.
So in an instant,
in year-long phases,
by happenstance yet
never-ceding
let there be seen
the traces, traces
of one's non-liberty,
of one's freedom.

Эдзік Мазько

У катоўні маёй пазгнівалі ўсе сьцены,
І разьбегліся вязьні ў чатыры бакі,
Толькі кат — сумны комік — забыты на сцэне,
У крывавым адзеньні стаіць ля ракі.
Сьмешна ўсё:
Столькі болю, пакуты і енку
Зьнікла ў марыве мокрай, дажджлівай зімы
І сплыло ціхім вечарам ў сумную Лету,
Пакідаючы патлы іржавай травы.

Edzik Maźko

In my torture-chamber the walls have all mouldered,
The prisoners escaped and are fled far and wide,
Only the torturer, sad clown, forgotten,
In bloodstained garb stands at the Riverside.
All is laughable:
So much pain, suffering, grieving,
In the damp mists of wet winters was lost,
Flowed on a calm evening down to sad Lethe,
Leaving but patches of rusty-red grass.

Галіна Булыка

Шлях аседлай ракі
пазначае лаза,
Адгукаецца мора
на покліч замовы.
Мы — вада:
наша семя, і кроў, і сьляза,
І малочная сьпеласьць
прымроенай мовы.

Сустракаюцца думкі
ў дрымоцьці дрыгвы.
Суплятаюцца мары
карэньнем падводным.
Уздымаюцца сокі падвялай травы
У вільготнае неба
дарогай нязводнай.

Нас вяртаюць аблокі і плыні туды,
Дзе на хвалі дрыжыць
каламуць залатая.
Мы — вада, а зямля прарастае з вады...
Скрозь суквецьці,
і крылы,
і кроў
Прарастае.

Halina Bułyka

Willows mark where
shrunken rivers run low,
The sea responds
to an order's proclaiming,
We are water:
our seed, blood and tears and the flow
Of milky ripeness of a language
we day-dreamed.

Thoughts are encountered
where drowses the marsh.
Day-dreams entwined
by roots under water,
Saps will rise up from the wilted grass
Into the moist sky
by road uncharted.

Clouds and streams bring us back to the flow
Where on the waves
golden flotsam will quiver.
We are water – from water earth grows
Through flower-heads
and wings,
and blood
It grows ever.

Вальдэмар Калінін

Ля возера стаіць старая ліпа,
з усіх бакоў яна відаць здалёку,
і сьнег і дождж яе не абмінаюць.
Гадуюць ліпу высьвіст, шчэбет, клёкат.

Шуміць лісьцё, ласкава шэпчуць травы,
ўсіх сонца грэе промнямі сваімі.
Дарогаю жыцьця праходзяць людзі,
адно што ліпа не гаворыць зь імі.

А колькі адышло людзей, якія
пад ліпаю густой адпачывалі,
сяляне — беларусы з цыганамі —
і весяліліся і гаравалі.

Каб на сваёй зямлі стаяць трывала,
пусьціла ліпа карані глыбока,
усіх яна ў завеі цьветам лечыць,
асьцерагаючы ад злога вока.

Ні скварy, ні ўрагану не баіцца,
нястомная на ўскоце, на закоце.
У ліпе пазнаю я лёс цыганскі
у скразьняках, у холадзе, у слоце.

Valdemar Kalinin

There at the lakeside stands an old lime-tree,
far and wide it can be seen in the distance,
snow and rain do not pass by nor ignore it,
tended it is by bird cries, trills and twitters.

The lime leaves rustle, the grass gently whispers,
and the sun warms all, its bright rays shedding,
there on life’s highway the people are passing,
but to speak with them the lime is not ready.

But there come, also, other folk wishing
’neath the thick lime-leaves to pass their leisure.
The village folk, Belarusians and Roma,
gather to talk and so take their pleasure.

So to stand firm on the earth here, the lime-tree
let down its roots, in the soil set them deeply,
in winter’s blasts its blossoms bring healing,
safe from the evil eye it will keep you.

Neither the squall nor the tempest affright it,
sunrise and sunset weary it never,
I find in the lime-tree the fate of the Roma,
in storm and sleet and chill winter weather.

Алег Мінкін

Зноў я вярнуўся ні з чым
Да гэтых згнілых варот,
Скуль праз няўрод і нішчым
Паразбрыдаўся мой род.

Я ненадоўга, але,
Божа, які гэта жаль —
Бачыць у стылай імгле
Сад абляцелы амаль.

Божа, ад пунь і ад хат
Цягне такою жальбой,
Што застаецца няшмат,
Каб не пакончыць з сабой.

Божа, калі ўжо й мяне
Перст Твой, як яблык, страсе —
Хай яшчэ раз сьлізгане
Цень мой па цёмнай страсе.

Aleh Minkin

Once more I've returned, bringing naught,
Back to this old rotten gate,
From which crop-failure and want
Forced my kin to walk away.

I'll not stay long here, but it's
Painful, God, when I see there,
Wrapped in the cold clammy mist,
The orchard that stands all but bare.

From houses and barns something draws
At me, God, with such pain,
That to end myself there seems good cause,
For little else now remains.

God, when Thy finger shall shake
Me, like apple down from the tree,
Grant that round that dark thatch my shade
One last time may glide quietly.

Алена Ігнацюк

Дэлякруа пісаў партрэт:
яна была ўсяго… Свабода.
Каўпак фрыгійскі — макаў квет.
Мо з модай колішняй нязгода?

Яна была ўсяго… Свабода.
І што хацела — ўсё магла:
дайсьці да царскага півота,
стаць калыханкаю арла.

Яна была ўсяго… Свабода
у інтэр'еры барыкад…
Дачка францускага народа…
Ды толькі мае мой пагляд.

І я, натхнёная Свабодай,
трымаю неба сіні сьцяг.
Не пагаджаецца зь нягодай
мой бел-чырвона-белы фрак.

Дэлякруа пісаў жанчыну,
што ведала, куды вядзе
і свой народ, сваю Айчыну…

Яна ўжо ў Край наш шпарка йдзе!

Alena Ihnaciuk

Delacroix painted a portrait true,
and she was… Liberty. Nothing other.
Her Phrygian cap — a poppy bloom.
Maybe not classic style, however?

And she was… Liberty. Nothing other.
And she achieved all that she tried:
reached a royal throne in her endeavour,
became the eagle's lullaby.

And she was… Liberty. Nothing other.
Behind the barricades in place…
True daughter she of France, her mother,
and yet she wears my very face.

And I, inspired by Liberty now
raise a blue flag on high to float,
the time is out of joint for me now
to wear white-red-white formal coat.

Delacroix drew a woman — see her —
who had the skill to understand
where to lead her folk, her *patrie*..

And now she's speeding to our land!

Юры Карэйва

Прамяністым раем чыстым
сьніўся нам наш Край айчысты,
а прачнуліся: над Краем
сьцяг Люцыпара лунае.
Чорт ятрысты, дух нячысты
на сьвяты наш Край айчысты,
на Хрыстовы сьцяг з Пагоняй
ланцугі наклаў сягоньня.
Хоць свабода зруйнавана
і над намі здань тырана,
але верма: час настане —
духу тут яго ня стане!
Хутка мы ізноў разгорнем
волі сьцяг — штандар з Пагоняй,
Край сьвяты, наш край айчысты
мы ад нечысьці ачысьцім!

Jury Karejva

Pure and gleaming, heaven-seeming,
our dear land was in our dreaming;
but above our land, woe-haunted,
Lucifer's flag now is flaunted.
Fiend of venom, unclean demon
on our land so holy-gleaming,
on our Christian White-Knight banner
evil fetters forged and hammered.
Now though freedom lies in ruins,
and o'er us a tyrant's ruling,
yet, believe: time will reverse all,
not forever will he curse us.
Soon we'll raise again, untrammelled,
freedom's flag, our White-Knight banner.
Native land, so holy-gleaming,
from uncleanliness we'll clean thee!

Тацяна Хмарка

Мы ня лічым дзён.
І складаем вершы.
Беларусь будзе жыць
І жыве.
Бы ў першы
Дзень свайго існаваньня
На нашай крывіцкай зямлі.

Мы ўздымаем сьцяг
Бел-чырвона-белы.
Мы адшукваем волю
Ў сівых залевах.
Нам яна падаецца
Далёкай і блізкай такой.

Дапаможа нам
Успамінаў вэлюм.
Мы вадою купальскае
Ночы здалеем
Урэшце з пылу сабранага
Ідала перамагчы.

Taciana Chmarka

We do not count days.
We compose our verses.
Belarus will live
And now lives.
As if on the first
Day of its existence
On the land of our Kryvian ancestors.

We are raising our flag
White-red-and-white.
We seek and find our freedom
In the grey-haired rain-storms.
And to us it seems
So far, yet so near.

Help will come to us
From the parchment of memories.
And with Midsummer
Night’s water we shall
One day at last overcome
The idol fashioned from dust.

Тамаш Сухавей

Кажуць,
што ў Краі ў нас
Госпад ступаў,
бачылі нават,
як сьлед ступакоў адмысловых
нібы Храм сьветлы стаў,
у які ні ўваходу,
ні выхаду
людзі ня йму́ць без замовы.
Храм той ведаю дзе,
ды забыўся я
ці змыліўся
словы замовы.
Гэй, валхвец!
Дай нам код ад засоваў!
Разнасьцеж нам наш Храм!
І Край адамкні для спатолі!
Мы ж табе —
згодна Госпада словаў —
ахвяруемся ў справе свабоды!

Tamaš Suchaviej

They say
God walked our Land
in ancient time;
they even saw
the prints of those wondrous sandals swelling
into a radiant Shrine,
which has no entrance
nor exit
unless you know the spell.
I know that Shrine, where it stands,
but have forgotten
or made an error
in telling that spell.
Hey, wizard,
give us the code to work the bolts!
Open wide the Shrine for us,
unlock our Land, our thirst relieving,
and we to you,
as saith the Lord,
will sacrifice ourselves for freedom!

Ян Мацур

Унізе холад. Цьмяны сьвет.
Астрог бэтонны. Цьвёрды камень.
Ён цягнецца за намі ўсьлед,
Каб зноў паўстаць перад вачамі.

Свой шэры колер бачым мы
Удзень і ўноч, зімой і ўлетку,
Ідзем, забыўшыся куды,
Ня чуем і ня бачым сьвету.

Жыцьцё, ты шлях усім шляхам,
Дарог асфальтавых бясконцасьць.
Мы сілы аддаем гадам,
Каб толькі раз убачыць сонца.

Наперад крок! Пагляд уверх!
І вось здабыўшы ўзнагароду,
Пераадолеўшы бар'ер,
Мы ціха рушым да свабоды!

Jan Macur

Cold below. A feeble light.
Hard stone. A concrete prison.
It drags behind us that it might
Appear once more before our vision.

Our own grey colour meets our eyes,
Day, night, summer, winter — it bounds us.
We go forgetting whither, why,
Nor see nor hear the world around us.

Life, you are path of all paths clear,
Infinity of asphalt highways,
We give our forces to the years
To see but once the sunlight shining.

Forward a pace! Upward the eyes!
Then having gained due guerdon meted,
And winning through barriers rise,
Quietly we'll move towards our freedom.

Аксана Данільчык

І ўзыдзе прыгажосьць
над горадам і сьветам,
над попелам і жарсьцю,
над верай і сумненьнем.
І ўсе раптоўныя «няўжо»
зьнямеюць перад гэтай ласкай
і аддадуць яе вяршыням
кароткі момант разуменьня.

І спраўдзіцца твой знак
наконт лагодных рухаў,
наконт ашчадных словаў
над сіняю прасторай.
І гэта будзе так,
як вольных сэрцаў грукат,
упэўнены, як сьмех
і як палёт кандора.

Aksana Danilčyk

And beauty will soar free
above the world, the city,
above ashes and embers,
above faith and doubt extending,
and all cries of 'Indeed'
before this grace will cease then.
And give its heights a brief
moment of comprehending.

Your sign will be fulfilled
in gentle movements' sweetness,
in words soft and caressing
above the azure yonder.
And so it shall be still,
as if in free hearts beating,
confident as a laugh,
as the flight of the condor.

Ціна Клыкоўская

Запахне порахам і цьвільлю,
бо — на вайне, як на вайне.
Праз сотні год, праз сотні міляў
мой меч вярнуўся да мяне.

Запахне золатам і цьвільлю,
бо кожны год наш — чорны год.
Зь мільёнаў ўзгорачкаў магільных
узьняўся апантаны сход.

Запахне верасам і цьвільлю,
бо ўпотай зьнішчаны народ
ад соннага душы бяскрыльля
ратуе верасовы мёд.

Так порах, золата і верас
з зацьвілых курганоў ўстаюць.
І вось тады ў Зямлю паверацъ.
І Беларусьсю назавуць.

Cina Kłykoŭskaja

The smell will be powder and mildew,
for — *à la guerre comme à la guerre*.
Hundreds of years and miles past — still now
my sword returns into my care.

The smell will be of gold and mildew —
each year of ours is black, is black.
Out of the millions of grave-hills now,
comes an assembly, a crazed pack.

The smell will be heather and mildew,
for the nation, by stealth brought low,
from the soul's wingless slumbers will now
to save the heather-honey go.

Then powder, heather, gold, upstanding
from mildewed graves will rise again.
And folk will have faith in the land then.
And 'Belarus' will be its name.

Генадзь Лапацін

Туга па дрэвах, смутак па вадзе,
вада — штодзённа, дрэва — гэта сьвята.
Вада — штодзённа, дрэвам ёсьць пачатак,
і ёсьць канца такіх дакладны дзень.
Рух плаўніка нагадвае узмах,
не паралельна рыбіна і птах,
не напалову рыбіна і птах,
не напалову, адначасова.
Адначасова — рыбіна і птушка,
Гасподзь нас тым аднойчы парадніў,
што не разьбіў падзелам нашы душы,
вада і дрэва вымяраюць дні.
Калі не сьвяткаваць адзін адное,
што іншае ім сьвяткаваць з табою?

Hienadź Łapacin

Yearning for trees, sadness for water,
water is workaday, wood is a festival.
Water is workaday, wood is a beginning
and for them both a final day is fixed.
A fin moves — memories of wing-beats stir,
they are not parallel, fish and the bird,
not turn and turn about, fish and the bird,
not turn and turn, but simultaneous.
Simultaneously fish *and* bird.
The Lord of old decreed this gift for us,
that He would not split our souls by division,
and wood and water measure out the days.
And if there be not mutual celebration,
what other way to celebrate with you?

Людка Сільнова

Свабода — гэта белы сьнег,
Які кладзецца на зямное,
На цьвёрды, учарнелы грэх, —
Як абяцанае, сьвятое.

Яна прыходзіць, як зіма,
Свабода: белае збавеньне.
Улёткаў круціцца гурма
Ці сьнегу белае насеньне?

Бягуць, зьнікаюць назаўжды,
Вужакамі ў спрадвечным моры,
Як восеньскія дні — гады,
Вільготныя ад сну і гора...

Свабода — гэта белы дзень
Паміж мінуўшчынай і сьветам
Наступнасьці. Туды вядзе
Мароз дзядоўскіх запаветаў.

Ludka Silnova

Freedom — this is the white snow
Spread as a pall on things terrestrial,
Upon sin, hard, blackened thrown
Like a promise, blest, celestial,

She comes like winter to the world,
Freedom: she our white salvation.
Is this a leaflet swarm that swirls,
Or white snow-seeds in wild rotation?

They flee, they disappear for aye,
Like snakes into the seas primaeval,
Like autumn days and leaves they fly
Moist from slumber and from grieving.

Freedom — this is the white day
Between the dead past and the breathing
Future world — to lead the way
Goes frost of ancestors' bequeathing.

Віктар Шніп

Мы жылі ў велізарнай краіне
і краіны ня мелі сваёй.
І, як мошкі ў густой павуціне,
мы зьнікалі самотна ў ёй.

Мы зьнікалі, як жоўтае лісьце,
як трава на сьцяжынах людзкіх.
І мы зьніклі б, як зьнікла калісьці
Атлянтыда ў глыбінях марскіх.

Мы жылі ў азіяцкай краіне,
той краіны даўно ўжо няма,
як лістоты няма на асіне,
калі ў сьвеце ўладарыць зіма.

Я ня плачу па тым, што мінула,
як ня плачуць крыжы на кладах.
Ува мне мая цемра заснула,
ува мне разгараецца Шлях...

Viktar Šnip

We lived once in a land gigantic,
though no land had we of our own.
And like moth in dense cobweb tangled,
there we were vanishing alone.

Vanishing like leaves sere and yellow,
like grass on pathways trodden down.
We vanished as of old, they tell us,
in ocean depths, Atlantis drowned.

We lived once in land Asiatic,
that country long since ceased to be,
as leaves, when winter rules despotic,
no more bedeck the aspen tree.

For what is past I do not weep now,
crosses on gravestones shed no tears.
In me, my darkness fell asleep now,
in me a blazing Path appears.

Людміла Рублеўская

На маёй дарозе — толькі сьнег,
Над маёй дарогай — толькі Бог.
Пакідаю свой самотны сьлед.
Кожны крок — нібы цераз парог.
А вакол — краіна ціха сьпіць,
Ціха замятае сьлед зіма.
І на прыдарожныя слупы
Нават ліхтароў у нас няма.
Цёмна — толькі ветаха сьвятло
Беднае, як бедны гэты край.
І сьляды Пагоні замяло
Па дарозе ў пекла — альбо ў рай.

Ludmiła Rubleŭskaja

On this road of mine there is but snow,
Above this road of mine there is but God.
And I leave my lonely trail to show.
Each step — as if across a threshold trod.
And all round the country softly sleeps,
Quietly winter sweeps the trail away,
And the roadside posts no longer keep
Any lamps to light us on our way.
Dark. Only light of a waning moon,
Poor as our land is poor, to aid our eyes.
And the Knight's trail was swept away too soon
On this road to hell or paradise.

Рыгор Сітніца

Ці памяць жабруе
    Па котлішчах колішніх дзён,
Ці сум пералётны
    Мне вочы запарушыў... —
Пра што ў пераходзе падземным
    Пяе саксафон?
Пра што яму рэха адказвае
    Зь нетраў душы?
Віно і самота
    Дапітыя сёньня да дна...
Аднак не ратуюць,
    Калі па сьлядах наўздагон
За мной неназваная,
    Чую, ступае віна,
Ды шанцам апошнім
    Хай музыка будзе адна.
Іграй, саксафон.
Аціхнуць няхай
    І гаворка, і грукат, і звон... —
Іграй, саксафон.
Іграй, мой адзіны
    Па смутку няпэўнаму брат.
Дарадцаў хапае,
    Але разуменьня наўрад.
Ня сьвятасьць —
    Аблуда цяпер узышла на амбон, —
Іграй, саксафон.
І цягнецца кожны
    Да скіпэтраў, ляўраў, карон...
Іграй, саксафон.
Няўжо сапраўды
    Мы аплачваем нейкі праклён?
Няўжо наша воля
    адно толькі мроя ды сон?

Ryhor Sitnica

Whether memory goes begging
    In deep dales of the days past and gone,
Or a migrant sadness
    Throws its dust in my eyes...
What does it play in the underpass
    That saxophone?
What do echoes proclaim
    As from the soul's depths they rise?
Today, wine and loneliness
    Have been drained to the last lees...
But they cannot save,
    While behind me I hear some unknown,
Unnamed guilt that treads
    In the footprints of my trail,
So let music alone
    Be the one chance that might yet avail.
Play, saxophone.
Let them grow silent,
    Shout, murmur and moan...
Play, saxophone.
Play then, my only
    Brother in sadness unclear.
Councillors there are plenty
    And yet understanding is rare.
Not holiness now.
    But deceit from the pulpit intones,
Play, saxophone.
And everyone strains,
    For sceptre and laurel and throne...
Play, saxophone.
Is it really that we
    Are doomed for some curse to atone?
Is our freedom no more
    Than a phantom or dream? Speak and own

Скажы, саксафон.
Ня карта —
　　Жыцьцё выстаўляецца сёньня на кон,
Бо сьвет, як цягнік,
　　Што вось-вось паляціць пад адхон...
Ратуй, саксафон.
Іграй, музыкант, —
　　Не змаўкай, не змані, не зграшы...
Даруй нам, што музыка
　　Сёньня каштуе грашы.
Даруй, што грашыў
　　Супраць музыкі і цішыні,
Што мала кахаў іх
　　У кожным падораным дні.
Даруй, цішыня, мне
　　І, музыка, — чуеш? — даруй.
Хай некаму глупствам
　　Усё, што я вам гавару,
Ды, як ні было б там,
　　Цяпер разумею аднак,
Хто музыку мае каханаю,
　　Той не жабрак.
Няхай ён апошні
　　У славе, пашане, грашах...
Ды музыку чуючы,
　　Госпада чуе душа.
І ў гэтым ёй воля,
　　І права, і шлях, і закон...
Іграй, саксафон.

The truth, saxophone.
Today, not on cards —
　　On our life now our stakes we depone,
For the world seems a train
　　That soon from the track will be thrown...
Help, saxophone!
Musician, play, —
　　Do not hush, do not lie, do not sin,
Forgive us, that today
　　Music costs hardly a pin.
Forgive the sins sinned
　　Against music and silence by me,
Loving them far too little
　　On every day granted to me.
Forgive me, then, silence,
　　And music, d'you hear, forgive too.
Though some will deem nonsense
　　All I am saying to you.
Be that as it may,
　　Clearly I now understand,
That with music to love
　　No one can be called 'beggar-man'
Though he be the last
　　In glory and cash and rewards...
For, hearing music,
　　The soul hears the voice of the Lord.
And in this are its freedom
　　Right, law and the Way truly shown...
Play, saxophone.

Сьвятлана Ўсьпенская

Адсутнасьць сэрца —
Як сьведчаньне болю.
Гэта —
Толькі слоўны выраз...
Дожджык салёны,
Вецер б’ецца
Мокрай, чужой далоньню.
Дзень асьлеп і вырас,
Вырас асілкам цэлым
Пустэчы сьляпуча белай.
Ціхая, ціхая справа —
Гэта тваё права.
Устань і ідзі па лёдзе
Пад рытм свайго сэрца адзіны,
Пад свой непаўторны рытм.

Śviatłana Ŭśpienskaja

Absence of the heart
Is the testimony of pain.
This
Is words, words only...
A small salty rain,
The wind slaps
With a wet, alien palm.
The day has gone blind, and grown,
Grown into a real titan
Of the white desert of blindness.
A quiet, quiet cause —
This right is yours.
Rise up, and walk on the ice
To the rhythm of your heart alone,
To your own unreplicable rhythm.

Анатоль Дэбіш

Хам вярнуўся на родныя гоні
З апраметнай — і проста на трон,
Нібы статак, анёлаў ён гоніць
Прочкі ў ноч, у нявер'е, на скон.
Сьцеле кветкамі ў храмы дарогі,
Крыж цалуе ў хлусьлівай журбе,
Хоць даўно ён ня ведае Бога,
Бо прызначыў ён Богам сябе.
Колькі людцаў служакамі сталі?!.
Ім ачмурана столькі галоў!..
Ну а тых, хто яго не прызналі, —
На пакуты, у турмы, у роў.
Вось табе і карона, і скіпэтар,
А табе — хіба дуля, народ.
Усьміхаецца з трона Люцыпар:
«Я прыйшоў не на дзень, не на год,
Да сьвятла я вас вывесьці мушу,
Паказаць вам, дзе ваш агарод,
Адбяру ваш і розум, і душы,
Ды напоўню ваш прагны жывот.
Што вам воля і што вам свабода?
Лепш жыцьцё без турбот і трывог».
І мільённае чуецца: «Згода!»
І грыміць па-над сьветам: «Наш Бог!»

Anatol Debiš

Ham came back to his native furrows,
Up from Hades, on to a throne.
Drove out the angels, like sheep in a flurry,
Into the night, into no-faith, — begone!
He strewed the path to the shrine with fresh flowers,
Kissed the cross as he shed lying tears.
Though he acknowledges no divine power,
He has deemed himself God through long years.
How many folk he turned into helots!
How long has he fooled them with his deceit!
And those who are not his fans and his zealots
— Into fetters and prison and pit.
Here for you is crown and a sceptre,
And two fingers for you, nation dear!
From the throne Lucifer smiles, so deceptive:
'I've come not for a day or a year!
Forth into the light I will lead you,
Show to you where your garden lies,
From soul and reason I'll dis-impede you,
And fulfil all your bellies' desires.
Why need you liberty? And why freedom?
Life is better without cares or fear.'
Million-fold the cry echoed: 'Agreed then!'
Over the earth thundered: 'Our God is here!'

Арына Балобан

Шукаю Цябе ў паднябесьсі далёкім,
ў скляпеньнях сінечы над галавой,
шукаю на вулках, змрочных і вузкіх,
шукаю ў сьвятынях, гатычных, высозных,
шукаю ў капліцах і ля крыжоў,
у тварах шукаю, блізкіх і родных,
прыветных усьмешках, далонях сяброў.
У сьнег і завею, слату і нягоду,
сонечным днём, у самотную ноч,
шукаю Цябе, бо ведаю добра —
Ты дзесьці ёсьць блізка, зрабіць толькі крок.
Шукаю, мой Божа, Цябе гэтак доўга,
забыўшы, што ўсё да крупінкі,
усё да апошняе кроплі —
пры мне, ува мне, па-за мною.
Усё гэта — Ты.

Aryna Bałoban

I have sought Thee in the vast expanses ’neath heaven,
in the high vaulting of blue overhead,
I have sought Thee in by-ways, gloomy and narrow,
sought Thee in Gothic shrines, soaring to heaven,
sought Thee in chapels and where crosses stand.
In faces akin and close to me sought ever.
In smiles of true welcome and in friendly hands.
In snow and in tempests, in sleet and grey weather,
in days filled with sunshine and in lonely nights
I have sought Thee, knowing in my endeavour
thou art close at hand, and one step will suffice.
I have sought Thee, my God, so long, forgetting
that everything to the very last morsel,
everything to the last droplet,
by me, within me, beyond me,
all this — is Thee.

Марына Наталіч

Бела-беднай як трываць галубцы?
Як трымаць надзею?
Паласа пунсовая на грудцы
Крывянее.
Аж дасюль страляюць і страляюць
Галубоў,
Што лётаць сьмеласьць маюць.

Гэты добры край зялёнабровы,
Што ўмывацца звык
Крынічнаю вадой,
Замятае завірухай папяловай,
Чорнаю бядой.

І галубка ў душнаце «черёмух»
Б'ецца нема
Над аглухлым краем.
Край ня чуе,
Што ў яго галубку
Ўсё страляюць.
Бо раздольле зграям.

Maryna Natalič

How shall she exist, weak white dove?
How persist, hope unceasing?
When on her breast a red groove
Is bleeding.
And the shots, and the shots fill the sky,
Aimed at doves,
That still have the boldness to fly.

This good land, with green brows curving,
Accustomed to bathe
In the freshet's clear flow,
Is swept by snowstorms of ash, whirling
Black woe.

And the dove, by choke-cherry gas stifled
Flutters dumbly,
Over the deafened land fleeing.
The land does not hear
How everyone in it
Shoots doves without reason.
— Open season.

Алесь Белы

Ці дажынкі тут, ці недарод,
ці парлямэнт гамоніць, ці соймы,
пхнецца ранкам на працу народ,
едзе сумна, нібыта на бойню.
А пад вечар народ будзе піць,
смак «чарніла» падасца салодкім,
хто зь іх марыць, каб яхту купіць...
Яхту?.. Можа гумовую лодку?..

Aleś Biełу

Whether harvest-home or famine lurks,
whether parliaments or diets babble,
at dawn the people scurry to work,
sadly they go, as to the shambles.
At dusk, though they will drain a pot,
'rot-gut' a taste of sweetness brings them,
one of them dreams to buy a yacht...
A yacht?... Perhaps a rubber dinghy?...

Ігар Пракаповіч

У Эўропу адпраўляецца цягнік,
На пэроне праважаючых няма.
Там даўно растаяў ледавік,
А у нас — зіма, зіма, зіма.
А я так хацеў купіць білет
І шчасьлівы сесьці у вагон,
Ды паўсюдна шыльды:
«Места нет»,
Хоць пусты цягнік, пусты вагон.
Але можна хоць да Калымы
Браць білет і ехаць на усход.
Ды нашто мне Азія? Зімы
Мне і так хапае тут штогод.
Марыў я у сьвеце пабываць,
Ды, напэўна, выпаў іншы лёс:
Дома лёд душой адаграваць
І чакаць, калі спадзе мароз.
Цягніку махне мая рука
І вярнуся я у родны дом,
Там сусед з выявай мясьніка
Прыйдзе ў карты рэзаць перад сном.
А празь дзень яшчэ адзін сусед,
Пры вусах і зь велічнай пляшнёй,
Будзе праклінаць заходні сьвет,
Бо ён пагражае нам вайной.
Я ня стану слухаць балбатню,
Буду піць суседзкі самагон
І згадаю, як насустрач дню
У Эўропу мкне пусты вагон.

poems on liberty

Ihar Prakapovič

The train is leaving shortly, Europe-bound,
No travellers, though, upon the platform stand.
Yonder, the glaciers long ago gave ground.
But this is winter, winter, winter's land.
I longed to buy a ticket, deemed it sweet
To take my place happily in the coach,
But everywhere signboards proclaim:
'No seats!'
Though empty stands the train, empty the coach.
Perhaps it might be possible to buy
A ticket to Kolyma — Eastward ho!
But what is Asia to me? Yearly I
Receive right here my fill of winter snow.
I dreamed that through the wide world I would roam,
But very different proved to be my fate:
To use my soul to melt the ice at home,
And until the frost is over — wait.
I'll give the train a wave as it rolls out,
Then back once more to my own home I'll creep,
And there my neighbour, butcher-like, no doubt,
Will rip me off at cards before I sleep.
Next day another neighbour'll come along,
Moustachio'd, in a huge coat; he'll roar
His wrath against the West, claiming with strong
Curses that it threatens us with war.
But I'll shrug all his foolish words away;
A flask of neighbour's moonshine I shall broach,
And I shall dream of how, at the break of day,
Into Europe rolls that empty coach.

Надзея Салановіч

Беларусь мая, васільковая,
і рамонкавая мая!
Беларускай ня стала «новаю»,
беларуска «старая» я.
Не шырокай хадою, а вузкай
я іду па тваіх палях,
несучасная я беларуска,
бо лаўлю я рамонкаў пах,
а ня мераю я палеткі,
каб сабе залаціць руку,
я у жыце зьбіраю кветкі,
і зайздрошчу я жаўруку,
што так вольна і шчыра льецца
яго песьня ў тых палях,
і я веру, і мне здаецца —
беларуска шчасьлівая я!

Nadzieja Sałanovič

My Belarus with cornflowers blooming,
my land of camomile!
I'm no 'new Belarusian' woman,
I cling to 'older' style.
Not by broad path, but narrow going
through your fields I wend.
I'm no modern lass, long ago I
breathed in your camomile scent,
I do not measure your ploughlands
to gild my palm, no, not I,
but in the rye gather flowers,
and envy the lark on high
because freely and so sincerely
its song flows the meadows through
and I believe, and feel clearly,
that this is happiness true.

Віктар Ярац

Нібы ў цемры, вобмацкам шукае
Маці не пачутае на золку слова,
Так дрыготкімі рукамі
Прымяраюць нітку і іголку.
Дзе сьляды згубіліся людзкія? —
Родныя пытаюць днём і ноччу.
Ходзіць вецер па шляхах бяз кія,
Хоць стары, ён нешта чуў аднойчы.
Стоміцца і на пяньку сагрэтым
Прызямліцца неўміручым дзедам.
Доўга ён блукаў па сьвеце гэтым,
Ґаласамі сьнедаў і абедаў.
Доўга ён хадзіў, а на пытаньні
Не адкажа маці адзінокай,
Толькі ліст пашле аднойчы ўраньні,
Ліст зь бярозы ды зьнямелых вокан.
Недзе неба папярхнецца дымам,
Вочы праціраючы ад пылу
З тарфяных палёў, дзе конскім грывам
Аваднёў страсаць з гарачых жылаў.
І нічога неба не адкажа,
Разьвядуць рукамі дрэвы горна,
Як маўчаньне гаркатою ляжа,
Не заглушыць гул яго маторны.

Чалавек аднойчы выйшаў з дому...

Viktar Jarac

As if in the dark, a mother, groping
Seeks for a word unheard at the sun's rising,
Just as trembling hands will poke a
Thread into the needle's narrow eye-slit.
Where then have those human footprints vanished? —
Day and night the kin repeat this question.
The wind ever walks its ways, old-mannish,
With no stick, yet once it heard some message.
This immortal grandsire, growing weary,
Sis down, on a sun-warmed tree-stump poising,
Long he's wandered through this world so dreary,
Breakfasting and dining aye on voices.
Long he's walked, yet, heedless of imploring,
No reply makes to that lonely mother,
Only will send her a leaf one morning,
Birch-leaf letter at dumb panes to flutter,
Somewhere, yonder, smoke will choke the heavens,
And eyes will be rubbed clear of the dust churning
From peat-bog's blaze, where gadflies are driven
By tossing horse-mane far from the veins' burning,
But as the trees spread their arms widely, highly,
No answer from the heavens will resound.
And Nothing-said on bitter bed will lie, in
A silence that no motors' drone will drown...

Once a man departed from his home...

Марыя Лук'яненка

Рабінавыя гронкі позьніх слоў
Падфарбавалі выцьвілае раньне.
Але якая ў верасьні любоў?
Але якое восеньню каханьне?

Вандруе ў небе сонечны павук,
Цыруе легкаважныя цянёты.
А зь безыменных пальцаў нашых рук
Пярсьцёнкі ў вырай
паляцелі ўпотай.

І залаты прымроены спакой
Плыве, віруе
ды ня помніць броду.
Стаіць за Гераклітавай ракой
Рабінавая ноч маёй свабоды.

Maryja Łuk'janienka

Rowan-fruit clusters of lost words
Have half-coloured the faded morning.
But in September, what love is stirred?
And what grand passion is there in autumn?

The sun-spider's wandering in the sky,
Fragile, delicate the webs it's weaving,
And from our third fingers, the rings fly
Migrating southwards
secret in their leaving.

And a golden calm, imagined, dreamed,
Flows and swirls,
the ford is now unheeded,
On the banks of Heracleitus' stream
Stands the rowan-night of this my freedom.

Валянціна Коўтун

Свабода! Ты ня знацьмеш кратаў,
хоць кроў твая плыве з нажа.
Быў Божы Сын на крыж узьняты,
нас расьпінаюць з-за крыжа.
Але пад небам хмарна-сінім
варожай зграі супраціў,
усе мы — з роду Эўфрасіньні
і ўсе да вечнасьці ўзьляцім.
Сябрыны гордае сумоўе,
у сэрцы — боль, у горле — крык,
упіваецца ў народ двухмоўе —
зьмяі раздвоены язык.
Але пад небам хмарна-сінім
варожай зграі супраціў,
на роднай мове з Эўфрасіньняй
у вечнае, сябры, узьляцім.
Свабода! Ты ня знацьмеш кратаў,
хоць кроў твая плыве з нажа.
Быў Божы Сын на крыж узьняты,
нас расьпінаюць з-за крыжа.
Свабода!

Valancina Koŭtun

Freedom! Thou know’st not bars’ restriction.
though from the knife flows thy blood’s tide.
God’s son was raised in crucifixion,
now for the cross we’re crucified.
But ’neath the clouded blue of heaven,
thou hast defied the foemen’s horde,
we are Euphrosyne’s kindred ever,
and to eternity we shall soar.
Friends meet in a proud convocation,
the heart holds pain, the throat a cry,
bilingualism has stung the nation
with double tongue of serpent-kind.
But ’neath the clouded-blue of heaven,
thou hast defied the foemen’s horde,
with *our* tongue, with Euphrosyne ever
to the eternal, friends, we’ll soar.
Freedom! Thou know’st not bars’ restriction.
Though from the knife flows thy blood’s tide.
God’s son was raised in crucifixion,
now for the cross we’re crucified.
Freedom!

Сяргей Панізьнік

Шчакочуць шчокі маразы.
Дзе
    дзень
        узьнёслы?
Зіма. Сьвіргочуць палазы.
Інеюць вёслы.
Прыслухаюся:
Ня я адзін
Хадок нязгоды.
Але ж пакуль вясны турботы, —
Паэтам стань, грамадзянін!
Не адкладай уздых на потым:
Плыве з раструшчаных ільдзін
Азон
    свабоды.

Siarhiej Paniźnik

Tickling frosts play on the cheeks,
Where is
        day
            raised aloft?
Winter. The sled-runners creak.
Oars are coated with frost.
I shall listen:
I'm not the only
Pilgrim of disagreement.
But until spring's worries meet us —
A poet, friend, you should become.
Do not 'put off till later' breathing:
For from the brash ice there flows
Ozone
    of freedom.

Галіна Дубянецкая

ці глыбока ці далёка ці блізка
праплывае ў пераменлівых бліскаx
нейкі горад апавіты зарою
быццам вольная струменіцца мроя

а падасца — гаманілі званіцы
бы хацелі да кагось дазваніцца
і падобныя да сноў распавесьці
пра жыцьцё тамтэйшае весткі

можа ў сьне а можа ў яве аднойчы
хтось адплюшчыць праясьнёныя вочы
і ў азуравае ўвойдзе сьвітаньне
і званіцы залатыя застане

Halina Dubianieckaja

whether at hand or deeply or remotely
in an ever changing glitter is floating
a city wrapped around with dawnlight gleaming
and like a free reverie it is streaming

and it seems that there are belfries that re-echo
as if they desired to call someone they beckon
and like to a vision brought in sleep they tender
news that speaks of life out there yonder

whether sleeping or awake someone will surely
one day open eyes that can see more clearly
and will enter in dawn’s azure streaming
and will reach those belfries gold-gleaming

Глеб Лабадзенка

Я думаў, што Свабода — гэта жах,
Калі ўсе палезуць на машыны
І пазьбягаюць ў іншыя краіны,
Пакінуць нас на нашых жа вачах.

Я думаў, што Свабода — гэта цень
Вясны і сонца, цень былога шчасьця.
Я думаў, што Свабода — гэта дзень,
Ў які даўно мы марылі папасьці.

Я думаў, што Свабода — гэта Сьвет,
Ў якім няма забруджаных плянэт,
Ў якім няма забруджаных газэт,
Сьвет, дзе народ казаць умее «НЕТ!»

Я зразумеў:
СВАБОДА — ГЭТА МЫ,
Палоханыя кратамі турмы.
Павінна быць у нашай галаве,
Што ні на што нягледзячы,
ЖЫВЕ!

Hleb Łabadzienka

I thought that Freedom is that dread
When everyone climbs on to lorries,
Before our eyes abroad they scurry,
Leaving us here when they are fled.

I thought that Freedom is the shade
Of spring and sun, happiness past,
I thought that Freedom is the day
That we've long dreamed to reach at last.

I thought Freedom a universe
Where no planet by filth is cursed,
Where no journal in filth's immersed,
And to say 'NO' folk are well-versed.

Now I know:
FREEDOM IS BUT US,
Whom fears of prison-bars oppress.
Still in our heads one thought should thrive,
That, in spite of all,
LONG LIVE...

Галіна Тварановіч

Ты сам пераводзіш стрэлкі гадзіньніка
бясконцых сусьветаў таемных лёсаў.
Ты сам — бэтлеемская чаканая зорка,
запаленая над прачыстай дугою
вялікаснай дамовы з чалавекам.
Ты сам — непазнавальны, усяісны,
кожнаму зычыш свае перамены,
еднасьць у сьвятле абяцаеш.
Вынайдзі ж апраўданьне і мне,
чэмернай, горкае кроплі
ў шчодрай задуме пра чалавецтва,
мне й усім, каго ў сэрцы трымаю,
і ўсім, да каго ня маю любові
ў малое сэрца ўмясьціць.
Вынайдзі, Божа, мне апраўданьне
на шляху да Твайго жніва.
І можа, не пераведзены шчэ стрэлкі...

Halina Tvaranovič

Thou Thyself hast reset the hands of the timepiece
of infinite universes, of fates mystic.
Thou Thyself art our Bethlehem star, long-awaited,
kindled high over that purest of arches
of the great covenant made with humanity.
Thou art unfathomable, omnipresent,
rendering unto each one his own changes,
unity in the light Thou dost promise.
Even for me then find justification,
a bitter drop and chimeric
in the generous plan for humanity,
for me and for all I hold in my heart's keeping,
and for all those for whom I have not love
to place within my small heart.
Find then for me, O God, justification
on the pathway to Thy harvest.
And maybe the hands have still not been reset...

Ян Чыквін

Сонца ходзіць па хаце
цёпла-сьветлаю зьявай,
мякка душу адчыняе,
сьцеле наўсьцяж надзею:
«Будзе жыць айчына
небам сваім і зямлёю!»
Ёсьць такая памклівасьць!

Ёсьць такая патоля!
Скінем няволі вярыгі,
жыць нам у сьвеце лепшым,
дзе кнігі чытаюць кнігі,
а вершы родзяць новыя вершы.

Ёсьць такая мажлівасьць!
І духу такая воля...
Будзе жыць айчына небам сваім і зямлёю.
І ўладай неаддзельнай Менску
пастромім беларускім словам зямлю
ад Бельску да Смаленску,
і Вільня стане нашым домам.

Jan Čykvin

Round the house the sun wanders,
a warmly radiant being,
opening the soul softly,
spreading hope straight and even:
'The land of our forebears will live
by its own earth and heaven!'
There exists such a yearning!

There exists such an easement!
We'll shed unfreedom's fetters,
a fairer world is destined for us.
Where books read books for the better,
and verses give birth to new verses.

There exists such a chance of turning!
And the soul has such will for freedom...
The land of our forebears will live by its own earth
and heaven.
By the inalienable might of Miensk
by the Belarusian word we shall build the land
from Bielsk to Smalensk,
and Vilnia shall be our home.

Віктар Шалкевіч

Хачу сказаць пра тое, што мяне найболей
зараз цешыць...

Мой малы сусед, сын п'яніцаў вясковых,
здольны хлопчык,
пры газьніцы, бо электрычнасьці ня маем,
штовечар піша вершы на свабоду.
Ён не Разанаў і не Барадулін, тым больш ня
Дудараў,
але зь яго, я бачу, будзе толк!

І вось такім аптымістычным словам
хачу я скончыць гэты змрочны дзень
на нашай неабсяжнай Беларусі...

Viktar Šałkievič

I want to tell you about what just now
gives me most pleasure...

My little neighbour, the son of village drunkards,
a bright little lad,
sits by the oil lamp (we've no electricity here)
each evening writing verses about freedom.
He's no Razanaŭ nor Baradulin, and certainly no
Dudaraŭ,
but I can see we'll hear of him, some day!

So, it is on this optimistic note
that I want to end this gloomy day
in our immeasurable Belarus...

Алесь Чобат

Чалавек выбірае сам —
ён уладца, жабрак ці хам.
Лёс ад Бога,
а выбар ягоны,
і свабода толькі ў адным —
менавіта, у выбары тым,
толькі там ніхто не скароны.
Але як прыдушыць жыццё,
то на волю просіцца ўсё
пагуляць тры дні ад няволі.

Колькі раз праз тыя вякі
рабавалі паноў мужыкі
і панамі ставалі паволі.
Так выходзіць у кожныя дні,
што ў спакоі, а што ў агні,
што ў далёкім, што ў нашым вяку.
Так свабоду і волю дзялю:
воля добрая халую,
а свабода жыве ў чалавеку.

А пакольκі зроблена так,
што ўладца, хам і жабрак
лёгка граюць даўнія ролі,
то няможна іх дакараць,
што ня хочуць яны выбіраць.
Бо свабода — складаней волі.

Aleś Čobat

Man himself chooses his lot,
master or beggar or clot,
fate's from God,
but the choice is man's ever,
and freedom means one thing alone:
that is: when the choice must be done,
no one feels compulsion or terror.
But when life seems to stifle and choke,
then liberty's everyone's hope,
three little days clear of slavedom.

In our age it so often occurred
that peasants first plundered the lords,
and then in time came to replace them.
Thus every day it transpires,
in peace-time as when under fire,
in our days and of old. I divide
therefore freedom from liberty, thus:
liberty's good for toadies and such,
but freedom within man abides.

And since this is so, everyone can
be they lord or clot or beggar-man
play their old part with facility,
and no one should blame or accuse
them that they've no wish to choose.
— For freedom is harder than liberty.

Віктар Швед

У вёсцы пачаліся спрэчкі:
«Жывем мы над адною рэчкай,
Адна зямелька ў апрацоўцы,
І молімся ў адной царкоўцы,

Адно ў нас сонейка, нябёсы,
Адным спалучаны мы лёсам,
Адно нам толькі невядома,
І нас хвалюе гэта — хто мы?»

Азваўся Ян (тут найстарэйшы):
«Усё жыццё я быў тутэйшым.
Відаць, мы ад пачатку сьвету
Будзем тутэйшымі ўсе тут».

«Павінны кімсьці быць, вядома, —
Негаваркі азваўся Сёма, —
Мы ўсё-ткі людзі, мы ня гускі,
Мяне завуць заўсёды рускім».

«Можа мы родам з Украіны? —
Тут запыталася Паўліна, —
Кажуць, што з ўкраінскай мовы
Заўсёды пазычаем словы».

Лявон дакінуў сваё слоўца:
«А можа ўсе мы тут літоўцы?
Было ж тут, пішуць летапісцы,
Княства Літоўскае калісьці».

«Жывем мы ў Польшчы. Мы — палякі, —
Запальчыва азваўся Якаў, —
Жывем мы ў прагрэсіўным сьвеце,
Ужо палякі мае дзеці».

Viktar Švied

The village held debate: 'We live here,
On the banks of this one river,
One the land that we till daily,
One the church in which we're praying.

One the sun high in one heaven,
One fate binds us all together,
One thing unknown our brains still taxes:
To know just who we are, exactly?'

Jan (the eldest) first grew vocal,
'All my life I've been a "local".
It seems that since the world's creation
"Local" we've been to this location!'

'We must be *something* — that's plain logic!'
Stated Sioma the laconic.
'We're people, and not geese, good cousins,
And always I've been told I'm Russian!'

'Maybe we're all from Ukraina?'
Came a question from Paŭlina, —
'Ever, they say, Ukrainian loan-words
We take and make into our own words'.

Lavon then put his word in plainly,
'Maybe we are all Lithuanian?
Right here, of old, scribes wrote in days of yore, the
Lithuanian princes' story'.

'We live in Poland. So we're Polish!'
Jakaŭ challenged with a flourish, —
'We live in a progressive era,
I've sons, and so as Poles I've reared them!'

Нэрвова ўскрыкнуў тут Кастусь:
«Дзе ж ваша, браткі, Беларусь!?
Бачу, пазбыцца вы гатовы
Нацыянальнасьці і мовы.

І быццам бы нам невядома,
Адкуль выводзімся і хто мы,
І сапраўды ўжо слухаць горка,
Што наша брыдкая гаворка,

Што быццам бы мы з горшай гліны,
Цурацца роднага павінны,
Што быццам існуе прымус,
Каб свайго зрокся беларус.

Ніхто нас не змушае, брацьця,
Каб свайго роднага цурацца,
Каб пастаянна з году ў год
Мы паміралі як народ.
Шануйма роднае, паверце, —
Каб ведаць хто мы, каб ня ўмерці».

With nerves all tense, then cried Kastuś,
'Where, brothers, is your Belarus?
I see you would deny forever
Nationality and tongue together.

As if some mystery our brain taxes;
Whence we come, who we are, exactly.
And truly, it is hard to listen
To such a talk, distasteful, twisted,

As if some lesser clay had framed us,
So that we view our own as shameful,
As if some mighty force or power
Made us deny all that is ours.

But no one drives us with compulsion
To view our own with such revulsion
So that, as every year goes by,
Our nationhood must slowly die.
Have faith; — hold what is ours as cherished,
Know who we are — and we'll not perish!'

Яраслаў Атлас-Маскалевіч

Бярозы беларускія,
Роднай зямлі напеў,
Лясныя сьцежкі вузкія
Віхляюць паміж дрэў.

Хаджу па гэтых сьцежачках
І мару аб жыцьці,
Калі ж вы з навамерачак
Пасьпелі вырасьці?

Вясновым пацяпленьнем,
Як толькі рухне сок,
Бяру з сабой начыньне:
Сьвярдзёлак і лубок.

І раніцой да ўсходу
Іду ў свой лясок,
Сабраць узнагароду —
Крыштальна-чысты сок.

І з захапленьнем прагным
Глытаеш той нэктар
Цудоўным днём вясеньнім —
Салодкі Божы дар.

Ад гэтай асалоды
Ў душы стане сьвятло,
Адчуеш стан свабоды,
Бясьпеку і цяпло.

Jarasłaŭ Atłas-Maskalevič

Birches of Belarus so fair,
Song of our native land,
Narrow woodland trails wind there,
With trees on either hand.

Along these narrow tracks I go,
And about life muse I,
How it is small saplings grow,
Until they stand so high?

And when the warmth of spring comes
And the sap surges up
I hasten there with gimlet
And little tree-bark cup.

Before sun-up each morning
To my wood I'm lured
Collect there, as rewarding,
That sap crystal-pure.

With thirsty joy, my plunder
Of nectar I gulp swift,
All in the spring day's wonder —
This is God's sweet gift.

And from that very sweetness,
The soul is filled with light,
You know a state of freedom,
Warmth, safety, and delight.

Генадзь Бураўкін

Мне бачыцца ў сёньняшняй здраднай імжы,
Якой мы ня згонім ніяк, —
У новага дня на далёкай мяжы
Ідзе нам насустрач юнак.

Вядзе за сабой ён натхнёны хаўрус
Такі ж, як і сам малады.
Яму я гукаю:
                    ідзі, беларус!
Ня сьцішвай змагарнай хады!

На нівах,
          дзе ўсё здратавала брыда,
Рупліва зьбірай камяні
І тых,
     хто сьвятую Радзіму прадаў,
На векі вякоў пракляні!

Hienadź Buraŭkin

In the treacherous mist, a sight I behold —
That mist we cannot drive away —
In the new day, upon the far border, a bold
Youth towards us is making his way.

An inspired band of brothers, all youthful as he,
Follows as onwards he leads.
'Belarusian!', I call to him,
                                        'Come rapidly,
Do not slacken your striving, your speed!'

'On fields
          where foul beasts trampled all, far and near,
Gather the stones carefully,
And let those
               who betrayed our blest Motherland dear,
Be accursed through all ages to be!

Соф'я Шах

Ой прастора ты, ой ты, прастора,
Ой ты, сьвет на зыходзе зімы!
Што было невыноснага ўчора,
Сёньня быццам забыліся мы.
І ўзіраемся ў далеч збавенна,
І расчулена слухаем шыр,
Гэта ён, гэта ён, несумненна, —
Баганосны прад намі эфір.
Вось ён поўніцца ў фарбах прасьветлых,
Вось ён сьвеціцца між сівізны,
У сьнягах, у лясах запаветных
Напярэдадні новай вясны.
Вось ім дыхаюць далі-абсягі,
Вось нябёсы струменяцца ім,
І зьнікаюць нядаўнія страхі
У далёкі дзесь прыцемак-дым.
Ані скрухі ўчарашняй, ні зморы,
Зноўку іх пераважыць памаглі
Звышмагутная сіла прасторы,
Звышадвечная цяга зямлі.

Sofja Šach

O spaces, I hail you, O spaces,
O world with the winter near-gone!
What yesterday was past all facing,
Today seems forgotten and done.
Redeemed, we scan distant profoundness,
Broad expanses we feel and we hear,
It is, yes it is, beyond doubting, —
The God-bearing ether is near.
Here colours replenish it, luminous,
Here in the grey it glows bright,
In the snows, in the forestland numinous,
On the eve of new spring gleams with light.
Here the far distances breath it,
Here heaven streams with it clear,
And recent terrors far-fleeing,
In shadow-smoke disappear.
Yesterday's grief and want leave no trace now,
We're survived, thanks to help past all worth,
That mighty-most power of nature,
That age-old-most tug of the earth.

Максім Лужанін

Заўсёды дбайна выглядаю
Бярно на зруб,
Каб у цябе, мой родны краю,
Сьпеў рваўся з губ.

Тады пачую цераз гліну,
Як на аблонь
Прыскочыць, выскубе травіну
Твой белы конь.

Не жарабя, а з той Пагоні,
Што празь вякі
На цэлы сьвет шамкамі звоніць
Напрасьцякі.

Напоўніцу хай сакаўную
Скубе траву,
А заіржэ, усе пачуюць:
Я зноў жыву.

Maksim Łužanin

Always I choose for my cabin
Logs firm and strong,
That from your lips, my dear land, throbbing
Will flow forth song.

Then through the clay I'll see what passes,
How in the leas
Your white stallion champs the sweet grasses,
Gallops at ease.

He is no colt; this is the Charger
That through long years,
Through the whole world with chiming harness
Raced without fear.

So, let him graze his fill of sappy
Grass, might and main.
He'll neigh, and all will hear him, happy.
I'll live again.

Вольга Іпатава

Я абрус памінальны паслала на сьветлым
тым полі,
Дзе жаўнеры Касьцюшкі лягалі на вечны спачын.
Шалатнула трава, і вятрыска пацьвердзіў —
«За волю!»
І прарос скрозь тканіну спакойны і мудры палын.

Засьцяліла я стольнікам слуцкую тую дарогу,
Дзе у сэрцаў пялёсткі ўгрызаліся кулі-чмялі.
«За свабоду!» — пранесьліся словы паўстанцаў над
логам,
І пакутніцкім цернам скрозь цяжкі абрус
прарасьлі.

Я пайшла ў Курапаты,
Дзе шэрымі клубамі болю
Вочы выеў туман у бярозы пахіла-крывой.
Там на крохкай бяросьце нязгасныя словы —
«За волю!»
Набрынялі гарачай —
Яшчэ ўсё гарачай — крывёй.

Я хацела ручнік завязаць
На крыжы ацалелым,
Ды расстрэльныя чэргі яго, як ланцуг, абвілі.
«За свабоду!» — і вырваўся голубам белым,
Каб ня згніць за нішто ў нялюбай зямлі.

Над дамамі, заціхлымі ў сонных турботах,
Над вірамі ў глыбокай таемнай вадзе,
Над палямі, салёным залітымі потам,
Кружыць вольная птушка — і крылаў яна
не складзе...

Volha Ipatava

On the bright field I draped a cloth like memorial
banner,
Where Kaściuška's soldiers lie in eternal rest,
The grasses rustled, the breeze 'For liberty' clamoured
And through the cloth the calm, wise wormwood
pressed.

With it I spread, like a table, the Słucak highway,
Where hornet-bullets bit the heart-petals through,
'For liberty' over the dale heroes' words came flying
And like martyrs' thorns through the heavy cloth they
grew.

I went to Kurapaty,
Where in grey swirls of anguish,
Mist ate out the eyes of the slender, swaying birch,
On the brittle bark 'For liberty' — words never
vanquished,
Swelled up with blood in a hot —
A still hot — surge.

I wanted to tie a towel
To the cross still standing,
But the line of the victims encircled it like a chain,
'For liberty', and it fled like white dove, and vanished,
So as not to perish on unloved earth in vain.

Over houses which have gown calm in slumber,
Over whirlpools in deep waters where mystery clings,
Over fields that with salt sweat are flooded,
The free bird flies – and does not fold its wings...

Вячаслаў Рагойша

О, Беларусь,
Каханка нябёс, загадка, мадонна!
За якія грахі асудзіў цябе Бог
На лёс выпрабавальнага палігона?
Хто не таптаў, не дратаваў
Палеткі твае ня вузкія?
Татары і прусы, немцы, французы,
Палякі і рускія.
Ніводная з войнаў — айчынных, сусьветных —
Не абышла цябе,
Пляжыла і мярэжыла.
Цела тваё каралі, цары, генсекі
Чацьвертавалі, палавінілі
Мовамі, верамі, дзяржаўнымі межамі.
Дзівіцца сьвет: што табе памагае —
Пацеры ці замовы?
Што за краіна, што за такая?
Зьнікалі дзяржавы, народы, мовы,
Яна — не зьнікае.
О, Беларусь,
Колькі вякоў палігоннасьць трывае!
Лязгае кратамі, хітрасьцю кратае.
Вось ізноў на табе
Выпрабоўваюць трываласьць:
Адны — дэмакратыі,
Другія — нацыі,
Чарнобыльскі чорт — чалавечай папуляцыі.

Viačasłaŭ Rahojša

O Belarus,
Beloved of heaven, enigma, Madonna!
For what sin did God punish you so,
Inflicting the fate of test-ground upon you?
Who has not tramped, who has not stamped down
Your fields and broad meadows?
Tatars and Prussians, Germans and Frenchmen,
Poles too, and Russians,
Never a war, 'patriotic' or 'world-war'
Has passed you by.
They flattened and cratered you.
Kings, Tsars or Gen-Secs all tore you,
Quartered you, halved you,
With languages, faiths, international borders.
The world is amazed: what is it helps you,
Prayer beads or incantations?
What kind of country do we have here?
States disappeared, languages, nations,
But she will not disappear.
O, Belarus,
How many ages as test-ground you suffered,
Here the bars clang, bars raised up with cunning.
Once more on you
They test out endurance:
Some test democracy,
Some test the nation,
Chernobyl fiend tests — the whole population.

Анатоль Вярцінскі

Вялікія думкі —
як сонца з-за хмар.
Цаню я іх яснасьць і напорнасьць:
«Сон розуму нараджае пачвар»,
«Дрымота душы спараджае подласьць»...
Душа ня можа ў спакоі гібець.
Ёй трэба рухацца, плакаць і пець,
палаць агнём, струменіць ракой,
ноччу стагнаць, сьмяяцца ранкам,
птушкай ляцець, біцца падранкам...
Закон існаваньня душы — неспакой.
Трэба яшчэ ёй, душы людзкой,
любіць і верыць, быць дасканалай,
поўніцца музыкай ідэалу...
Закон існаваньня душы — неспакой.
Трэба яшчэ ёй, душы людзкой,
жыць па сумленьні, праўдзе і волі,
балець краіны роднай болем...
Закон існаваньня душы — неспакой.
І ў гэтым яшчэ адна з зарук,
што адбудзецца нашае адраджэньне,
што ў справы нашай няма сканчэньня, —
ёсьць толькі рух, ёсьць толькі рух.
І — мы выходзім. І — мы ідзём.
Сталы і юны, белы і русы,
бацька з сынам, маці зь дзіцём,
адзін з адным... Ідуць беларусы!

Anatol Viarcinski

Great thoughts,
like sun breaking through clouds. I honour
their driving impetus and their brightness.
'The sleep of reason produces monsters.'
'Slumber of soul begets base slyness.'
The soul cannot languish in peace and in rest,
it needs to move, to weep, sing its best,
to stream like a river, blaze like fiery coal,
to groan like the night, to smile like the dawn,
to soar like bird, flutter like fledgling new-born...
Unrest is the law of life for the soul.
One more thing it needs to be human and whole,
to love and believe, to be perfect and real,
to be filled with the music of an ideal.
Unrest is the law of life for the soul.
One more thing it needs to be human and whole,
to live by conscience, truth and free-will,
to ache with the ache of one's native land still.
Unrest is the law of life for the soul.
And one further condition exists
for our rebirth to find realization,
for our cause not to face annihilation —
only movement this is, only movement this is.
And we shall come forth, and we shall go on,
light-haired and brown, adult and youth then,
mother and babe, father and son,
one with another, go forth Belarusians.

Славамір Адамовіч

Не для гномікаў партыі —
для сябе здабываю свабоду.
Жыву, як заўсёды, упарта я,
зьнішчаю плябейства пароду.

Свабода мая ня кніжная,
ня тая, калі ўсё, што хочацца
можна рабіць і пыжыцца,
і лярвай у ложку варочацца.

Свабода мая вызвольная
ваўчыцай цяжка параненай
выходзіць з лагва падпольнага
і ўецца незаарканенай.

Свабода мая беларуская
крывёю чыстай крывавіцца
і стужкай вузенька-вузкаю
сьцякае па белай правіцы…

Sławamir Adamovič

Not for wee gnomes of the Party,
for myself I'm seizing freedom.
As always, I live, stubborn-hearted,
negating all traits plebeian.

My freedom's not literary,
does not mean that all one wishes
one can do, essay, unwary,
like larva in a bed twisting.

My freedom is liberty's urging,
like a wolf-bitch that, wounded gravely,
from underground den emerging,
roams untrammelled, unrestrainedly.

My freedom, true-Belarusian,
with unsullied blood is bleeding,
on my white sword-arm diffusing,
it trickles — a thin, thin streamlet…

Валянцін Тарас

Не забівай прэзыдэнта!
Ня варта.
Хай сам ён штодня памірае ад страху,
ад жаху,
якога зіркатая варта
ня можа спыніць ля ягонага гмаху.

Не забівай прэзыдэнта!
Ня трэба.
Хай сам памірае ад страху штоночы,
што ўсё-ткі і ён не вышэйшы за Неба,
што сочаць за ім ўсёвідушчыя вочы.

Навошта табе забіваць прэзыдэнта?
Страх ліхаманкава дасьць яму рады.
Страх — гэта яго пажыцьцёвая рэнта,
адзіны ягоны набытак з улады.

...Цікае страху нябачная міна —
найлепшая кара за ўсе вераломствы.
У сьне, як вулькан, уздыхае краіна,
поўніцца лавай народнае помсты.

Не забівай прэзыдэнта!

Valancin Taras

Kill the President? No!
It’s not worth it.
Let him die each day rather from terror
from horror,
that, though their sight’s perfect,
guards can’t keep from his residence ever.

Kill the President? No!
Pointless, even!
Let him die each night as terror snatches,
knowing that he is not higher than Heaven
that with all-seeing eyes ever watches.

What gain will it bring you to kill him?
This terror will bring him quietus.
Terror that as life’s rental will fill him,
the sole heritage of his status.

...A visage unseen will maintain a
watch on that terror — just sentence.
The land stirs in its sleep, like volcano
fills with lava of the people’s vengeance.

Kill the President? No!

Алесь Лiпай

Цяпер ты можаш піць нагбом уладу
і марнатравіць людзкія надзеі,
але надыдзе час, і возьме плату
зь цябе народ за ўсе ліхія дзеі.

Надыдзе час, і люд захоча праўды.
І то ня ўсёй, а толькі тое з праўдаў,
дзе не народ падманвацца быў рады,
а ты яго бязьлітасна падманваў.

Надыдзе час, і люд захоча праўды.

І нават не яе, а толькі ведаў,
што зло не абмінула пакараньне,
і першым той, хто сам з дубінкай бегаў,
якраз цябе абвінавачваць першым стане.

Надыдзе час, і люд захоча праўды.

І нават не яе, а толькі помсты,
за тыя беды і за тую беднасьць,
куды завёў ты грамадзянаў простых.
А з помстай да людзей прыходзіць еднасьць.

І мо на гэтай, зыбістай хоць, глебе
паўстане нацыя.
І нацыя паўстане.
І прага не відовішчаў ці хлеба,
а прага волі кіравацьме тым паўстаньнем.

І, гледзячы, як гмах тваёй улады
пераўтвараецца ў магільны камень,
адкрыеш ты, што жорсткі Бог расплаты
жыве з табою ў зруйнаваным храме.

Aleś Lipaj

Now you can quaff dominion, drink it deep,
and waste all human hopes and aspirations.
But time will come when for your evil deeds
the people will demand due compensation.

The time will come; people will want the truth.
But not the whole truth, only that small piece
of which nation was not gladly duped,
as you duped it time and time without cease.

The time will come; people will want the truth.

Not even truth, but only to know surely
that evil has not escaped unpunished,
and the first who will accuse you duly
is he who lately ran wielding a truncheon.

The time will come; people will want the truth.

And not even that, but vengeance meet
for the sorrows, woes and destitution
you brought the man and woman in the street,
and from that vengeance people will find union.

And maybe on that soil — albeit shaky —
will rise a nation.
A nation will rise then.
The thirst for bread and circuses forsaken,
a thirst for liberty will lead this rising.

And seeing your dominion's tower transmuting
into a tombstone, you'll learn from this sign
that the unbending God of retribution
dwells with you within a ruined shrine.

Леанід Дранько-Майсюк

Свабода Беларусь у летуценьні.
У даўніне здабыўшы даўніну,
Перад красой упаўшы на калені,
Цалуе і Сафію, і Дзьвіну.

Свабода Беларусь у кніжным раньні
У Прагу кліча, у вандроўны прах,
Каб назаўсёды ў гэтым вандраваньні
Стварыўся самы беларускі шлях?

Свабода Беларусь — душа, змаганьне,
Зьнявечаная здрадаю зямля,
І на яе высокае дыханьне
Накінута лукіская пятля...

Гаспода Беларусь — гаркота ў горле,
Спавіта адвакацкаю мальбой,
І просьба застаецца: «...каб ня ўмёрлі!»
Адзінаю малітваю жывой;

Гаспода Беларусь у напаміне:
«Мне засталася спадчына...» — а ўсім
Застаўся край, дзе памяць вечна гіне,
Дзе на трасянцы можна скласьці гімн:

«Я жыву у калхозі «Свабодны пуць»
І мне у ём харашо, пакуль
Плывуць вутаўкі маі — вуць, вуць, вуць!
Ходзяць курачкі маі — пуль, пуль, пуль!»

Leanid Drańko-Majsiuk

Freedom Belarus in mists of dreaming,
In the past the past has duly gained,
And beholding beauty, kisses, kneeling,
Dźvina's stream and St Sophia's fane.

Freedom Belarus in bookish morning,
Calls to Prague and to dust of vagrancy,
So that with eternal wandering worn so,
The Belarusian path must come to be.

Freedom Belarus is soul and striving,
A land by treachery maimed and abused,
And its lofty breathing has been stifled,
For Łukiški jail has cast its noose,

Household Belarus — a bitter relish
Choking the throat, swathed in a pleader's plea,
And one request remains still: 'Lest we perish!'
One living prayer offered constantly.

Household Belarus — to be remembered:
'This heritage has come to me...' — meanwhile
This is a land where memory fades ever,
And they write anthems in a jargon-style:

'I lif in Kollektiv *Rote Track*.
Und full mein Life ist mit gut Luck,
While schwim mein Ducklinks — quack, quack quack!
Und run mein Chickens, cluck, cluck, cluck'.

Алесь Жамоцін

Цемра, пустыня,
ўваходзіны зла,
вусны асьмяглыя,
сьвята асла,
целы галодныя,
злосьці нагар,
душы халодныя,
чорнае «кар-р-р-»...

Aleś Žamocin

Desert and darkness,
evils amassed,
lips dry and parching,
the feast of the ass,
bodies all hungered,
souls chilled past thaw,
burnt wick of anger,
and a black 'kra-ar-rr!'

Алесь Калесьнікаў

Я не разумею, чаму
сьвет ператварыўся ў турму?
У абдымкі вечнай зімы
трапілі, няшчасныя, мы.
Кружаць над сялом груганы
ў прадчуваньні новай вайны.
На руках у нас — кайданы.
У вачах вісяць туманы.
Недзе нема выюць ваўкі.
Як баімся мы іх, бедакі!
Сьвет ператварыўся ў турму.
Каму гэта патрэбна? Каму?

Aleś Kaleśnikaй

I try to understand — but fail —
why this world became a jail?
An eternal winter's grasp
holds us, luckless, in its clasp.
Ravens round the village soar,
presaging another war,
fetters on our arms press tight,
a mist hangs before our sight,
somewhere, wordlessly, wolves howl;
how we shake with fear, poor souls!
The world turned into a jail.
Whom, though, whom does it avail?

Ірына Паўловіч

Зрываюць наш дзяржаўны сьцяг,
А мы — маўчым.
Пагоню топчуць на вачах,
А мы — маўчым.
Над роднай мовай адны зьдзекі,
А мы — маўчым.
Ня дурні мы, і не калекі,
Але — маўчым.
У турмы садзяць, варанкі,
А мы — маўчым.
Дэкрэт, маўляў, у іх такі,
А мы — маўчым.
Людзей зьнішчаюць па начах,
А мы — маўчым.
У душах невядомы страх,
І мы — маўчым.
Нарэшце мушу закрычаць:
Дакуль жа будзем мы маўчаць!

Iryna Paŭłovič

Our state flag into shreds they slash;
We hold our peace.
And our Pahonia they now smash,
We hold our peace.
On our tongue they cast ignominy,
We hold our peace.
Though we're not cripples, are not ninnies,
We hold our peace.
In transport trucks and jails men sit,
We hold our peace.
We're told decrees will deal with it —
But hold our peace.
People perish in the night,
We hold our peace.
Our souls are filled with nameless fright;
We hold our peace.
Till I must cry, without surcease:
How long shall we still hold our peace?

Андрэй Мельнікаў

Дзе палі і лясы,
там чуваць галасы
тых, хто прыйдзе пасьля,
і цябе і мяне
можа быць памяне
спакваля.
Перасяляцца нашы душы ў дубы
ці ў буслоў,
і забудуцца тыя,
хто здольны забыць,
пра дабро і зло,
і працягне зьмяняцца, як і датуль,
навакольны сьвет,
ні дабра ні зла,
толькі крык бусла —
запавет.

Andrej Mielnikaй

Fields and woods all around,
and there voices resound
of those yet to be,
and then you and I might
raise a memory slight,
gradually.
Transmigrating, our souls into oaks shall be sealed,
or stork's brood;
they'll forget,
all those who
at forgetting are skilled,
about evil and good.
The great world will still change, all things will go
as they hitherto went,
evil, good will not come,
the stork's cry is the one
testament.

Зьміцер Бартосік

Мне б нарадзіцца шэрым віленскім катом
Такою ж шэрай восеньскай гадзінай,
Каб быць прыродным, паўнапраўным і адзіным
Тых пляцаў, вуліцаў, дамоў гаспадаром.

Майго сусьвету мне хапала бы штодня,
Каб і да сьмерці ім не надзівіцца
Ад Пагулянкі да далёкага Зьвярынца,
Дзе кожнае гарышча — нераскрыты скарб.

Мае няшчасныя двухногія сябры
Прыгожа і свабодна жыць не заміналі б.
Я б харчаваўся толькі у «Чырвоным Штралі»,
А ўлетку лена спаў на Замкавай гары.

У сакавіку б распачынаў такі канцэрт,
Што ўсе пародныя, дагледжаныя коткі
Зьбягаліся б ад Добрай Рады да Ліпоўкі,
Каб паспытаць мой не абы-які імпэт.

Мне невядомы быў бы чалавечы жах
Ад акупанцкіх крокаў патруля начнога,
Перабягаў бы ім апошнюю дарогу,
Бы цень зьнікаючы ў Антокальскіх дварах.

Свой вольны век пражыўшы, нібы лорд,
Я б змог аднойчы без стагнаньняў недарэчных
На могілках старых любімага Зарэчча
Залегчы, каб сустрэць апошні свой усход.

Мне б нарадзіцца шэрым віленскім катом.

Źmicier Bartosik

I wish I'd been born a grey Vilnia cat,
In an autumn hour of grey gloaming,
To live naturally, independent, the only
Lord of these squares, streets, houses, habitats.

My universe would suffice me each day,
My whole life would not wear out my interest in it,
From Pahulanka out to far Źviaryniec
Like treasure unopened, each attic would wait.

My poor two-legged friends whom fortune serves ill,
Would not interfere with my life free, unharrowed,
I should dine only at the 'Red Arrow'
And in summer drowse lazily on Castle Hill.

In March I would raise such a concert, indeed,
All the queen-cats, well-pedigreed, cosseted, tended,
From Lipoŭka to Dobraja Rada, intending
To try my rare passion would haste with all speed.

And I'd never know that dread human fear
— The tramping of foreign troops in the night-time,
I'd cross their last path, and like a shade, quietly,
In the Antokal courts I should disappear.

And then, having lived my free life, like a lord,
Without useless groans or complaining,
In dear Zarečča, in the old graveyard,
I'd quietly lie down to await my last dawn.

I wish I'd been born a grey Vilnia cat.

Ірына Дарафейчук

Я раскажу табе казку.
Ноч за акном закалыша
Дрэвы, і птушак, і зоркі —
Я раскажу табе казку,
Слухай, зьдзіўляйся і думай.

Недзе — ня ў нас, а за сьветам,
Цень захінае прастору,
Хмары стаяць над вадою,
Хіляцца хмары над полем,
Лес затуляюць і нівы.

Недзе — ня ў нас, а за сьветам,
Дзень ад маланак чырвоны,
Жоўты ад вогнішча вецер,
Чорны дзірван ад выжарын,
Шэрыя травы ад дыму.

Недзе — ня ў нас, а за сьветам,
Громы зямлю скаланаюць,
Рэхам шпурляюцца горы,
Птушкі вясёлыя — кулі —
Звонкія песьні сьпяваюць.

Недзе — ня ў нас, а за сьветам,
Сьмелыя гордыя людзі
Гінуць за праўду і волю...
Гэта ня страшная казка?
Слухай, зьдзіўляйся і думай.

Недзе — таксама за сьветам,
Сонца ня гасьне ніколі,
Сонца над лесам і полем.
Нават — зірніце у студню —
Сонца са студні сьмяецца.

Iryna Darafiejčuk

Let me tell you a story,
Outside the window, night cradles
Trees and the birds and the starlight —
Let me tell you a story,
Listen, wonder and ponder.

Somewhere — not here, but far yonder,
Space is bent by a shadow,
Clouds stand over the water,
Clouds bow over the ploughland,
Embrace the green crops and the forest.

Somewhere — not here, but far yonder,
Day has grown crimson from lightning,
Wind has grown yellow from bonfires,
Turf torched and scorched into embers,
Grasses have grown grey from smoke-fumes.

Somewhere — not here but far yonder,
Thunders have set the earth shaking,
Mountains re-echo with roaring
And merry songbirds — the bullets —
Like chiming bells make their music.

Somewhere — not here but far yonder,
People, proud and courageous,
Perish for truth and for freedom...
Say, is this story not fearful?
Listen, wonder and ponder.

Somewhere — likewise beyond world's end,
The sun is never extinguished,
The sun shines on fields and on forests.
Even — see in the well-waters —
The sun from well-waters is laughing.

Сьветла і цёпла жывецца,
Бо між зямлёю і небам
Хмары ня кожны заўважыць,
Бо асьвятляюць абшары
Штучна сьляпучыя промні.

Недзе — ня ў нас, не турбуйся,
Дзень не ад дыму счарнелы,
Сьвет не ад вогнішча жоўты,
Зьзяе-мігціць над зямлёю
Колер адзіны — падману.

Не зварухнецца прастора.
Ціха — аж вушы займае,
Быццам адно засталіся
Здрадцы, віжы і забойцы,
Зладзіўшы ўсе свае справы.

Слухай, зьдзіўляйся і думай.
Гэта ж ня ў нас, а за сьветам
Моўчкі сядзяць у балоце
Злыя стамлёныя людзі...
Гэта — ня вечная казка?..

Brightly and warmly folk live there,
For between earth and the heavens
Clouds go ignored and unheeded,
For they illumine broad space there
With rays artificially burning.

Somewhere — not here, do not worry,
Day has grown black — not from smoke-fumes,
Yellowed the world — not from bonfires,
High above earth gleams and twinkles
One single colour — deception.

Space there will never know motion,
Silence aye muffles the ears there,
As if nothing remains there, save only
Traitors, sneak-bailiffs and slayers,
Who have completed their business.

Listen, wonder and ponder.
Not here, but far away yonder
Silently sit in the marshes,
Evil folk, worn out and weary...
Is this not a story eternal?...

Алесь Макрацоў

Гледзячы на зоркі, што загадкава сьвецяцца ў начным небе, я задумваюся над пабудовай сьвету. Спрабую асэнсаваць ягоную бясконцасьць. Спрабую спасьцігнуць бязьмежжа.

Спрабую і... не магу.

Звыклыя адзінкі вымярэньняў, якія на Зямлі фізычна адчувальныя, нібы камяні ў руцэ, — кінутыя ў бяздоньне і не сустрэўшы там перашкоды — імкліва аддаляюцца. Зьнікаюць з вачэй. Робяцца космасам.

Бясконцасьць немагчыма зьмерыць тым, што мае пачатак і мае канец...

Сусьвет ня ўкладваецца ў маёй галаве да тае пары, пакуль успрымаю яго ня столькі духоўна, колькі фізычна. Пакуль адасобліваю яго ад сябе.

Але розум падказвае мне, што пяць зьнешніх пачуцьцяў: зрок, слых, нюх, смак, пачуцьцё дотыку, — памеры тае прасторы, у якую ён зьмешчаны ад пачатку.

Дух кажа мне: мяжа сусьвету існуе толькі ў табе самім.

Як шкарлупінай яйцо, сусьвет для чалавека адмежаваны ягонымі пачуцьцямі.

Шостым пачуцьцём.

Сёмым пачуцьцём — розумам.

Aleś Makracoй

Gazing at the stars, which enigmatically twinkle in the night sky, I ponder over the structure of the universe. I try to sense its infinity. I try to grasp its boundlessness.

I try, and... I cannot.

The common units of mensuration which on Earth are physically perceived, like stones in the hand, are cast into the abyss, and, not encountering there any obstacles, retreat into remoteness. Disappear from sight. Become the Cosmos.

Infinity cannot be measured by that which has a beginning and has an end...

The universe does not fit into my head until I perceive it not so much spiritually as physically. Until I distinguish it from myself.

But reason tells me that the five external senses: sight, hearing, smell, taste, touch are measures of that space in which it has been located from the beginning.

But the spirit tells me: the measure of the universe exists only in yourself.

Like the shell of an egg, the universe for man is measured by his senses.

The sixth sense.

The seventh sense is the reason.

Антаніна Хатэнка

Прымаю Волю Тваю, Божа, —
    зьлятаю і падаю ў жыцьцё.
У беспрасьвецьце й бездарожжа
    жывічна час мой перацёк.

Тваю прымаю, Божа, Волю —
    іду й пераўзнаўляю Шлях.
Свабода ў цёмным чыстым полі
    мне голас падае здаля.

Мой Божа, Волю звыш прымаю —
    мудрэю і мужнею тут.
    Усё Свабода абдымае —
    дабро і ліха, лад і суд.

Прымаю Мудрасьць Тваю, Божа, —
    малю, пакутую, люблю.
    Дух ахінае абярожна
    Свабоду, неба і зямлю.

Любоў Тваю прымаю, Божа, —
    і зь пекла вырастаю ў рай.
    Хай дапаможа й пераможа
    мая Свабода Выбіраць.

Antanina Chatenka

I accept Thy Will, O God,
    I fly down, into life descend,
here, without radiance, without road,
    in lively mode my life I spend.

I accept, O God, Thy Will,
    I walk, and recreate the Way,
from a field dark and empty, still,
    Freedom calls to me by name.

God, I accept the Will of Heaven,
    wiser, more warrior-like I grow,
    Freedom embraces all things, even
    due order, court-trials, good and woe.

I accept Thy Wisdom, God,
    I pray, I suffer and I love,
    the Spirit watches, without nod,
    Freedom and earth and heaven above.

And I accept, O God, Thy Love,
    I grow from hell to heaven, indeed.
    Grant that my Freedom of Choice may prove
    able to succour — and succeed.

Карлас Шэрман

Маленства
на гарачым кані
па сьпярэшчаным сухарэччы,
па тунэлях
зялёнага небасхілу
дрэваў, што абдымаюцца ў вышыні
з прудкім ветрам на скронях,
які яшчэ і сёньня адчуваю,
як пошапт руху зямлі
нястомленай у паўторах.
Як палёт жыцьця незабыты,
што нібыта ня ўмее лётаць
па боскіх прасторах.

Чаканьне падзеі,
якую робіш
за крокам крок,
пошук слова, зарок,
што шырыць зрэнкі,
калі твае асмакуе вусны
гэтага слова водар дзівосны,
ды яго льга мацаць,
льга адчуць
форму нябёсную,
абдойм зь няўстойлівымі абрысамі,
лініямі, лінамі,
якія зьмяняюць сэнс штохвілінна,
сутнасьць і вартасьць слова,
што расьце на даланях дзён,
даючы і квецень і плён,
і ціха жыве ў радках,
тоячы свой несутрым
у абсягу малым
жыцьця кароткага.

Karłas Šerman

Infancy
upon a hot horse
by the ravine of a dried-up river
by tunnels
of the green horizon
